Parliamentary Assembly
Assemblée parlementaire
https://pace.coe.int
COUNCIL OF EUROPE
CONSEIL DE L'EUROPE

**Парламенцкая Асамблея**

**Рада Еўропы**

**Дак. 15783**
05 чэрвеня 2023 г.

# Вырашэнне канкрэтных праблем, з якімі сутыкаюцца беларусы ў выгнанні

**Даклад**[1]
Камітэт па пытаннях міграцыі, уцекачоў і перамешчаных асоб
Дакладчык: Поль ГАЛЬ, Люксембург, група Еўрапейскай народнай партыі

*Кароткі змест*

Пасля сфальсіфікаваных выбараў 9 жніўня 2020 года некалькі сотняў тысяч беларусаў, якія былі вымушаныя пакінуць сваю краіну, ратуючыся ад рэпрэсій з боку рэжыму Аляксандра Лукашэнкі, знайшлі прытулак у краінах-удзельніцах Рады Еўропы. Гэтая сітуацыя вымушанай эміграцыі пацягнула за сабой мноства выпадкаў парушэння іх асноўных правоў.

Гэты даклад разглядае шэраг праблем, з якімі сутыкаюцца беларусы ў выгнанні — ад падачы заявак на візу і легалізацыі пражывання да доступу да адукацыі, працаўладкавання і аховы здароўя. Гэтыя праблемы могуць мець сур'ёзныя наступствы ў штодзённым жыцці, у дадатак да рызыкі расправы над сваякамі, якія засталіся ў Беларусі. У дакладзе падкрэсліваецца неабходнасць адрозніваць беларусаў ад рэжыму, ад якога яны ўцяклі, і адзначаецца ключавая роля, якую адыгрываюць Святлана Ціханоўская і розныя органы, створаныя дэмакратычнымі сіламі, у тым, каб задаволіць патрэбы суайчыннікаў. Яшчэ адзін ключавы аспект, вылучаны ў дакладзе, — адраджэнне беларускай мовы і культуры як жыццёва важных элементаў суверэнітэту і неабходнасць іх падтрымкі.

Даклад адзначае, што чым геаграфічна бліжэй да Беларусі знаходзяцца краіны, якія прынялі ўцекачоў, тым больш адпаведныя ўлады імкнуцца задаволіць патрэбы беларусаў у выгнанні праз прыняцце законаў і правядзенне адпаведнай палітыкі. Даклад заклікае краіны-ўдзельніцы Рады Еўропы ажыццявіць, у шчыльнай кансультацыі з дэмакратычнымі сіламі, захады, якія дапамогуць беларусам лягчэй пераносіць іх выгнанне да таго часу, калі яны змогуць вярнуцца ў дэмакратычную Беларусь.

[1] Спасылка на камітэт: дак. 15593, спасылка 4680 ад 10 кастрычніка 2022 г.

**Змест** **Старонка**


A. Рэзалюцыя ... 3

B. Тлумачальны мемарандум. Поль Галь, дакладчык ... 7

1. Уступ ... 7
2. Агульны кантэкст ... 8
3. Становішча беларусаў на выгнанні ... 9
   - 3.1. Легальны ўезд і пражыванне ... 11
   - 3.2. Пагрозы свабодзе перасоўвання ... 14
   - 3.3. Адмова ў консульскіх паслугах ... 15
   - 3.4. Пагрозы бяспецы ... 15
   - 3.5. Салідарнасць з Беларуссю ... 16
   - 3.6. Доступ да адукацыі ... 17
   - 3.7. Прафесійная кар’ера на выгнанні ... 18
   - 3.8. Захаванне беларускай ідэнтычнасці і культуры ... 19
   - 3.9. Падвойнае выгнанне пасля ўцёкаў з Украіны ... 20
4. Высновы і рэкамендацыі ... 21

## А. Рэзалюцыя

**Рэзалюцыя 2499 (2023)**[2]

# Вырашэнне канкрэтных праблем, з якімі сутыкаюцца беларусы ў эміграцыі

**Парламенцкая Асамблея**

1. Парламенцкая Асамблея глыбока занепакоеная лёсам сотняў тысяч беларусаў, якія апынуліся ў эміграцыі, бо не мелі іншага выбару апроч уцёкаў ад рэпрэсіўнага рэжыму Аляксандра Лукашэнкі. Сфальсіфікаваныя прэзідэнцкія выбары 9 жніўня 2020 г. знішчылі апошнія сумненні адносна сутнасці гэтага рэжыму і паказалі яго сапраўдны характар, ператварыўшы Беларусь у турму пад адкрытым небам, дзе правы чалавека зведзеныя на нішто.

2. Асамблея нагадвае пра рэзалюцыю 2433 (2022)«Наступствы агрэсіі Расейскай Федэрацыі супраць Украіны: роля і адказ Рады Еўропы», у якой яна выказала сваю рашучасць «узмоцніць сваё ўзаемадзеянне з беларускай грамадзянскай супольнасцю, праваабаронцамі, незалежнымі журналістамі, навуковымі коламі і дэмакратычнымі сіламі, якія паважаюць каштоўнасці і прынцыпы Арганізацыі».

3. Асамблея ўражаная стойкасцю, мужнасцю і рашучасцю беларусаў у выгнанні, якія змагаюцца за перамогу дэмакратыі ў сваёй краіне. Асамблея ўсведамляе, што новая перашкода ў гэтым змаганні паўстала 24 лютага 2022 г. з шырокамаштабнай агрэсіяй Расейскай Федэрацыі супраць Украіны, у якой бярэ актыўны ўдзел рэжым Лукашэнкі. Асамблея шкадуе аб тым, што чым больш часу праходзіць з 9 жніўня 2020 г. — дня, калі Лукашэнка фактычна прайграў выбары, — тым на даўжэйшы час адсоўваецца вяртанне беларусаў, якія апынуліся ў выгнанні.

4. Асамблея вельмі ўражаная працай і ініцыятывамі офісу Святланы Ціханоўскай і Аб'яднанага пераходнага кабінета Беларусі, якія накіраваныя на аказанне суайчыннікам тых паслуг, у якіх рэжым ім наўмысна адмаўляе.

5. Асамблея прызнае, што беларускі народ нельга атаясамліваць з рэжымам Лукашэнкі, і ўважае, што беларусы ў выгнанні не павінны зазнаваць дыскрымінацыі з-за ўдзелу гэтага рэжыму ў вайне супраць Украіны.

6. Асамблея падкрэслівае, што большасць беларусаў, якія былі вымушаныя пакінуць сваю краіну ў кантэксце прэзідэнцкіх выбараў 2020 года, маюць адзінае жаданне: вярнуцца ў дэмакратычную Беларусь. Таму важна, каб краіны, якія прынялі беларусаў, рабілі ўсё магчымае, каб забяспечыць ім легальнае пражыванне і годныя жыллёвыя ўмовы ў адпаведнасці з іх асноўнымі правамі, гарантаванымі Еўрапейскай канвенцыяй па правах чалавека (ETS № 5) і іншымі адпаведнымі інструментамі Рады Еўропы, у чаканні ўсталявання дэмакратычнага рэжыму ў Беларусі.

7. Асамблея глыбока абураная тым, што рэжым Лукашэнкі працягвае аказваць ціск на тых, хто пакінуў краіну, у прыватнасці, адмаўляючы сваім грамадзянам у консульскіх паслугах і пагражаючы іх бяспецы.

---

[2] *Дэбаты ў Асамблеі* 20 чэрвеня 2023 г. (16-е паседжанне) (гл. дак. 15783, даклад Камітэта па пытаннях міграцыі, уцекачоў і перамешчаных асоб, дакладчык: Поль Галь). *Тэкст, прыняты Асамблеяй* 20 чэрвеня 2023 г. (16-е паседжанне).

8. Асамблея адзначае, што ў той час як многія еўрапейскія краіны адкрылі свае межы для беларусаў, чым бліжэй да Беларусі знаходзяцца гэтыя краіны, тым лепш яны разумеюць становішча ўцекачоў.

9. Асамблея ўхваляе намаганні Літвы і Польшчы знайсці прававыя і практычныя рашэнні, каб прыняць беларусаў-уцекачоў, і адзначае, што можна зрабіць яшчэ больш.

10. Асамблея шкадуе, што столькі бар’ераў і перашкод усё яшчэ існуюць для тых, хто апынуўся за мяжой, і перакананая, што лепшае веданне сітуацыі ў Беларусі і палітычная воля — неабходныя перадумовы для прыняцця мер, якія максімальна аблегчаць цяжкасці знаходжання ў эміграцыі.

11. Асамблея заклікае дзяржавы-ўдзельніцы прызнаць, што ўнікальная сітуацыя, у якой апынуліся беларусы ў выгнанні, патрабуе нестандартных рашэнняў, каб гарантаваць, што яны будуць жыць як мага больш свабодна да таго часу, калі яны змогуць вярнуцца ў дэмакратычную Беларусь.

12. Асамблея вітае стварэнне Камітэтам міністраў кантактнай групы па супрацоўніцтве паміж Радай Еўропы і беларускімі дэмакратычнымі сіламі і грамадзянскай супольнасцю. Гэтая мадэль супрацоўніцтва *sui generis*, упершыню створаная міжнароднай арганізацыяй з удзелам беларускіх дэмакратычных сіл, накіраваная на выкарыстанне падтрымкі і досведу Арганізацыі для ўмацавання беларускага дэмакратычнага грамадства ў адпаведнасці з асноўнымі каштоўнасцямі Рады Еўропы. Асамблея таксама радая вітаць прадстаўнікоў беларускіх дэмакратычных сіл у працы сваіх камітэтаў паводле рашэння Бюро Асамблеі.

13. Асамблея ўпэўненая, што надышоў час перавесці ў дзеянне палітычную падтрымку, якой беларускія дэмакратычныя сілы карыстаюцца сярод краін-удзельніц, і што захады, якія робяцца супраць рэжыму Лукашэнкі, не павінны закранаць людзей, якія змагаюцца супраць гэтага рэжыму.

14. Асамблея перакананая, што, каб забяспечыць поўную павагу да правоў чалавека беларусаў, пакуль яны знаходзяцца ў выгнанні, і, у канчатковым выніку, каб паспрыяць пераходу іх краіны да дэмакратыі, дзяржавы-ўдзельніцы Рады Еўропы павінны ажыццявіць адносна простыя і недарагія меры ў межах сваёй юрысдыкцыі для гэтых асоб.

*Легальны ўезд і пражыванне*

15. Пры выкананні візавых патрабаванняў і забеспячэнні неабходных мер праверкі бяспекі, дзяржавы-удзельніцы павінны імкнуцца трымаць свае межы адкрытымі для тых, хто ўцякае ад рэжыму Лукашэнкі, прымаючы, сярод іншых, наступныя меры:

    15.1. выдача гуманітарных віз ва ўсіх амбасадах і консульствах, якія яшчэ працуюць у Мінску, і пашырэнне правоў на атрыманне такіх віз на сваякоў палітвязняў;

    15.2. стварэнне і забеспячэнне магчымасці выдачы віз краін Еўрапейскага Звязу ў тых краінах-удзельніцах, у якіх для грамадзян Беларусі не патрабуецца віза, без патрабавання дазволу на жыхарства ў гэтых краінах;

    15.3. выдача шматразовых шэнгенскіх віз для сваякоў беларусаў у выгнанні, якія прыязджаюць іх наведаць на кароткатэрміновай і часовай аснове;

    15.4. выдача больш працяглых шматразовых віз, якія будуць выкарыстоўвацца ў якасці запаснога варыянту для тых, хто знаходзіцца пад пагрозай арышту ў Беларусі. Абавязак па выяўленні і распазнанні асоб, якія падвяргаюцца гэтай рызыцы, ускладаецца на Аб'яднаны пераходны кабінет Беларусі. Дакладна вызначаныя крытэрыі павінны быць распрацаваныя Кабінетам сумесна з партнёрамі з дзяржаў-удзельніц.

16. Дзяржавы-ўдзельніцы таксама павінны спрыяць правядзенню экспертных перамоваў

паміж сваімі міграцыйнымі органамі і адпаведнымі прадстаўнікамі беларускіх дэмакратычных сіл у выгнанні, каб знаходзіць прагматычныя рашэнні праблем па меры іх узнікнення.

17. Дзяржавы-ўдзельніцы заахвочваюцца рабіць адпаведныя захады, каб забяспечыць празрыстасць у працэсе прыняцця няўрадавымі арганізацыямі (НУА) рашэнняў па выдачы рэкамендацый у падтрымку візавых заявак або працэсу легалізацыі.

18. Дзяржавы-ўдзельніцы павінны як мага хутчэй распрацаваць прававыя інструменты, якія дазваляюць легалізаваць знаходжанне беларусаў у эміграцыі, калі такія інструменты яшчэ не створаныя.

19. Асамблея прызнае важнасць захавання псіхалагічнай раўнавагі і пачуцця бяспекі для тых, хто не па сваёй волі або гвалтоўна мусіў пакінуць свой дом, і заклікае дзяржавы-ўдзельніцы забяспечыць доўгатэрміновую легалізацыю для беларусаў у выгнанні, пазбегнуўшы такім чынам непатрэбных перашкод і стрэсу.

20. Каб падтрымаць працу сваіх адпаведных міграцыйных служб, дзяржавам-удзельніцам прапануецца падрыхтаваць інфармацыйны бюлетэнь па Беларусі і забяспечыць для сваіх супрацоўнікаў праграму па вывучэнні фактычнай сітуацыі ў краіне, каб дапамагчы ім прымаць аператыўныя і абгрунтаваныя рашэнні па асобных справах.

*Свабода перасоўвання*

21. Дзяржавам-удзельніцам прапануецца ў супрацы з Еўрапейскай камісіяй знайсці адэкватныя рашэнні, каб дазволіць беларусам у выгнанні падарожнічаць у межах Еўрапейскага Звязу, у прыватнасці, шляхам сістэматызацыі выкарыстання «пашпарта замежніка» і/ці шляхам працягу прызнання пашпартоў Рэспублікі Беларусь, тэрмін дзеяння якіх скончыўся.

22. Асамблея таксама запрашае дзяржавы-ўдзельніцы ў шчыльнай супрацы з Еўрапейскай камісіяй і Міжнароднай арганізацыяй грамадзянскай авіяцыі (МАГА) абмеркаваць з адпаведнымі прадстаўнікамі беларускіх дэмакратычных сіл у выгнанні магчымасць выдачы пашпартоў для грамадзян Беларусі ў выгнанні, якія будуць прызнаныя дзяржавамі-ўдзельніцамі.

*Бяспека*

23. Асамблея падкрэслівае, што пазбаўленне грамадзянства не павінна прыводзіць да безграмадзянства і што, нават калі Беларусь не з'яўляецца ўдзельніцай канвенцый Арганізацыі Аб'яднаных Нацый аб безграмадзянстве, усе дзяржавы павінны выконваць прынцыпы міжнароднага права і заканадаўства аб правах чалавека; нагадвае, што Беларусь прыняла рэкамендацыю Грузіі ў рамках трэцяга цыклу Універсальнага перыядычнага агляду ААН; і адзначае, што Беларусь паабяцала далучыцца да абедзвюх канвенцый Арганізацыі Аб'яднаных Нацый аб безграмадзянстве на Сегменце высокага ўзроўню па праблеме безграмадзянства ў 2019 г. З увагі на вышэйсказанае, Асамблея настойліва заклікае дзяржавы-ўдзельніцы зрабіць усё магчымае, каб прызнаць важнасць усталявання працэдур вызначэння безграмадзянства, якія, у сваю чаргу, забяспечаць абарону асобам, якія засталіся без грамадзянства, у тых дзяржавах, дзе яны знаходзяцца.

24. Праз тое, што зварот у беларускае консульства, напрыклад, для атрымання даведкі аб несудзімасці, неабходнай для працэсу легалізацыі або для падаўжэння тэрміну дзеяння пашпарта, можа прывесці да рэпрэсій або пагроз у дачыненні да сваякоў заяўнікаў, якія засталіся ў Беларусі, або да саміх заяўнікаў, дзяржавам-удзельніцам настойліва рэкамендуецца не патрабаваць дакументаў, якія можна атрымаць толькі праз афіцыйныя беларускія каналы.

25. Дзяржавы-ўдзельніцы павінны ўстрымлівацца ад экстрадыцыі беларускіх грамадзян у выгнанні на падставе «чырвоных паведамленняў» Інтэрполу, зробленых на запыт рэжыму Лукашэнкі, з увагі на выкарыстанне гэтым рэжымам крымінальнага пераследу ў палітычных мэтах. У сумнеўных выпадках ім прапануецца спраўджваць запыты Інтэрполу з Беларусі праз Упраўленне па аднаўленні законнасці і правапарадку Аб'яднанага пераходнага кабінету Беларусі, у склад якога ўваходзяць былыя супрацоўнікі праваахоўных органаў, звольненыя па палітычных матывах, і якія, такім чынам, валодаюць неабходнай кваліфікацыяй, досведам і доступам да баз дадзеных.

26. Асамблея занепакоеная тым, што інфармацыя, перададзеная еўрапейскімі банкамі беларускім банкам, выкарыстоўвалася беларускімі спецслужбамі для пераследу праваабаронцаў у Беларусі. Асамблея заклікае дзяржавы-ўдзельніцы заахвочваць прыватны сектар у сваёй дзейнасці звяртаць належную ўвагу на пытанні правоў чалавека і праяўляць неабходную належную абачлівасць, каб абараніць беларускіх праваабаронцаў, якія з'яўляюцца кліентамі прадпрыемстваў прыватнага сектару, ад рызыкі далейшага пераследу ў выніку іх аперацый або абмену інфармацыяй. Акрамя таго, дзяржавы-ўдзельніцы павінны зрабіць усё магчымае, каб не даць рэжыму Лукашэнкі магчымасць злоўжываць мерамі міжнароднага супрацоўніцтва па пытаннях злачыннасці ў якасці дадатковага інструмента для рэпрэсій.

27. Увогуле, дзяржавы-ўдзельніцы не павінны разглядаць Беларусь як бяспечную краіну. Ім прапануецца накіраваць пракурору Міжнароднага крымінальнага суда лісты-рэкамендацыі, якія б выказвалі іх занепакоенасць сітуацыяй у Беларусі і прасілі адказу на паведамленне, накіраванае ў адпаведнасці з пунктам 2 артыкула 15 Рымскага статута Міжнароднага крымінальнага суда пад назвай «Сітуацыя ў Беларусі/Літве/Польшчы/Латвіі і Украіне: злачынствы супраць чалавечнасці ў выглядзе дэпартацыі і пераследу» 19 траўня 2021 г. Міжнароднай арганізацыяй па правах чалавека, Нарвежскім Хельсінкскім камітэтам, Global Diligence LPP і Truth Hounds.

*Дэмакратычныя сілы ў выгнанні*

28. З улікам таго, якую вялізную ролю могуць адыгрываць Народныя амбасады Беларусі, асабліва ў якасці каналаў сувязі з нацыянальнымі ўладамі, Асамблея цвёрда перакананая, што дзяржавы-ўдзельніцы павінны наладзіць з імі працоўныя адносіны як з прадстаўнікамі дэмакратычнай Беларусі і прадугледзець для іх падтрымку ў выглядзе арганізацыйнай, інфармацыйнай і матэрыяльнай дапамогі, з мэтай развіцця іх кампетэнцый і жыццяздольнасці.

29. Асамблея настойліва заахвочвае парламенты тых дзяржаў-удзельніц, якія яшчэ не зрабілі гэтага, стварыць парламенцкую групу сяброўства для стварэння сеткі для абмену найлепшымі ідэямі і практыкай падтрымкі беларусаў у выгнанні. Асамблея перакананая, што такая сетка таксама спрыяла б дыялогу з беларускімі дэмакратычнымі сіламі ў выгнанні, у тым ліку з офісам Святланы Ціханоўскай, Аб'яднаным пераходным кабінетам Беларусі і Каардынацыйнай радай.

30. Асамблея таксама запрашае дзяржавы-ўдзельніцы вылучыць сродкі і зрабіць свой унёсак у дзейнасць, узгодненую ў рамках Кантактнай групы Рады Еўропы па Беларусі, у прыватнасці, выкарыстоўваючы крокі, прапанаваныя Сакратарыятам Асамблеі ў раздзеле «Умацаванне палітычнага дыялогу».

*Падтрымка грамадзянскай супольнасці*

31. Асамблея перакананая ў неабходнасці стварэння ўмоваў для забеспячэння ўстойлівасці арганізацый беларускай грамадзянскай супольнасці ў выгнанні, у прыватнасці шляхам прадстаўлення ім інструментаў і сродкаў для мабілізацыі сваіх суайчыннікаў у выгнанні, ажыццяўлення іх дзейнасці і захавання бачнасці. Асабліва гэта тычыцца арганізацый, якія займаюцца развіццём і ўмацаваннем беларускай мовы і

культуры.

32. Падкрэсліваючы ролю, якую адыгрывае Экспертная рада па заканадаўстве аб няўрадавых арганізацыях Канферэнцыі міжнародных няўрадавых арганізацый Рады Еўропы (Канферэнцыя МНУА) у падтрымцы свабоды асацыяцый у Еўропе, Асамблея настойліва рэкамендуе дзяржавам-удзельніцам запытваць меркаванні Экспертнай рады аб мерах, якія шкодна ўплываюць на дзейнасць беларускіх НУА ў выгнанні, і прымаць адпаведную палітыку.

33. Асамблея таксама заахвочвае сяброў Канферэнцыі МНУА супрацоўнічаць і дапамагаць беларускім НУА ў выгнанні.

*Падтрымка адвакатаў у выгнанні*

34. У кантэксце рэпрэсій, з якімі сутыкаюцца юрысты ў Беларусі, і ў сувязі з тым, што многія адвакаты знаходзяцца ў выгнанні за мяжой, Асамблея заклікае прызнаць Беларускую асацыяцыю адвакатаў правоў чалавека арганізацыяй, якой давяраецца прасоўванне і абарона правоў чалавека адвакатаў, пазбаўленых права займацца сваёй прафесіяй у Беларусі, і павышэнне ўзроўню і даступнасці юрыдычнай дапамогі.

*Доступ да адукацыі і культуры*

35. Асамблея прызнае, што дзеці могуць пацярпець ад вымушанага выгнання іх бацькоў, і ў сувязі з гэтым заахвочвае краіны, якія прымаюць уцекачоў, неадкладна інтэграваць беларускіх дзяцей і працаваць над умацаваннем іх нацыянальнай самасвядомасці і культуры. Асамблея нагадвае пра актуальнасць інструментаў моўнай адукацыі і моўнай інтэграцыі дзяцей, распрацаваных Радай Еўропы, якія могуць быць выкарыстаныя для дапамогі ў працэсе інтэгравання новапрыбылых беларускіх дзяцей у звычайныя класы. У той жа час Асамблея таксама падтрымлівае стварэнне беларускамоўных класаў у школах, дзе ёсць дастатковая колькасць беларускіх дзяцей, адкрытых як для прадстаўнікоў беларускай нацыянальнай меншасці, гэтак і для тых, хто прыбыў нядаўна.

36. Асамблея, уражаная аднаўленнем цікавасці да беларускай мовы і культуры, рашуча падтрымлівае ініцыятывы арганізацый грамадзянскай супольнасці па захаванні і ўмацаванні беларускай мовы і культуры сярод прадстаўнікоў г. зв. «старой» дыяспары і тых, хто прыбыў зусім нядаўна. Таму Асамблея настойліва заахвочвае дзяржавы-ўдзельніцы садзейнічаць стварэнню выдавецтваў, якія працуюць на беларускай мове, выкладанню беларускай мовы і культуры ва ўніверсітэтах і распрацоўцы новых інструментаў для падтрымкі пашырэння беларускай мовы і культуры сярод тых, хто знаходзіцца ў эміграцыі, а таксама ў межах Беларусі. Асамблея ўважае, для беларускай дзяржаўнасці крытычна важна, каб яе культура і мова зноў занялі сваё належнае месца.

37. З увагі на тое, што ў апошнія гады ў Беларусі адбываецца наступ на акадэмічную свабоду, Асамблея будзе вітаць стварэнне навуковага часопіса для ліберальна настроеных навукоўцаў як у выгнанні, так і ў Беларусі, які будзе індэксавацца ўплывовымі базамі дадзеных цытавання, такімі як Scopus, Web of Science або Google Scholar.

38. Асамблея прызнае ролю Еўрапейскага гуманітарнага ўніверсітэту, які з 2005 г. знаходзіцца ў выгнанні ў Вільні, — адзінага беларускага ўніверсітэту, які можа працаваць на грунце акадэмічнай свабоды і далучанасці да еўрапейскіх каштоўнасцей. Асамблея запрашае дзяржавы-ўдзельніцы і Еўрапейскі Звяз надалей падтрымліваць гэтую ўстанову і адкрываць новыя магчымасці для таго, каб яна працягвала развіваць творчае, свабоднае і крытычнае мысленне сярод беларускіх студэнтаў і была здольная прыцягваць навукоўцаў і студэнтаў з краін Усходняга партнёрства.

39. Асамблея разумее важнасць тэрміналогіі і належнай транслітарацыі з беларускай мовы

і настойліва рэкамендуе дзяржавам-удзельніцам правільна транслітараваць усе тэрміны, якія тычацца Беларусі.

*Доступ да фінансавых паслуг і эканамічная дзейнасць*

40. З увагі на тое, што прыватныя асобы, прадпрыемствы і арганізацыі грамадзянскай супольнасці сутыкаюцца з цяжкасцямі пры адкрыцці банкаўскага рахунку ў некаторых дзяржавах-удзельніцах, Асамблея просіць, каб дзяржавы-ўдзельніцы заахвочвалі свае банкі праводзіць адрозненне паміж рэжымам Лукашэнкі і людзьмі, якія ўцяклі ад гэтага рэжыму. Гэта можа быць дасягнута, у прыватнасці, шляхам правядзення працэдуры *due dilligence* «Ведай свайго кліента» належнымі і адпаведнымі структурамі, прызначанымі беларускімі дэмакратычнымі сіламі ў выгнанні.

41. Асамблея заахвочвае ўрад Украіны супрацоўнічаць з беларускімі дэмакратычнымі сіламі ў выгнанні, асабліва з Аб'яднаным пераходным кабінетам Беларусі, каб правесці дэталёвыя праверкі банкаўскіх рахункаў беларусаў, якія знайшлі прытулак ва Украіне, і, у выпадку станоўчага выніку такіх праверак з пункту гледжання нацыянальнай бяспекі Украіны, перайсці да разблакавання 50-ці астатніх банкаўскіх рахункаў, якія ў дадзены момант недаступныя для іх уласнікаў.

42. Асамблея вітае той факт, што многія прадпрыемствы здолелі пераехаць з Беларусі, у прыватнасці, у Грузію, Літву і Польшчу, але адзначае, што ў гэтай сферы ўсё яшчэ застаюцца цяжкасці. Асамблея заахвочвае рабіць захады, якія змогуць аблегчыць працэсы перадачы, акрэдытацыі, набыцця, доступу да крэдытаў, доступу да аўдытарскіх паслуг і г.д. У гэтым кантэксце яна ўважае, што праграма Poland Business Harbour («Польшча. Гавань для бізнесу») можа служыць перспектыўнай практыкай для пераймання іншымі дзяржавамі-ўдзельніцамі. У канчатковым выніку, Асамблея верыць, што гэтыя прадпрыемствы, незалежна ад таго, ці працуюць яны ў сферы інфармацыйных тэхналогій, рознічнага гандлю, лагістыкі, дробных паслуг або будаўніцтва, калі ім дазволіць функцыянаваць і плаціць падаткі, зробяць унёсак у эканоміку тых краін, дзе яны знаходзяцца, і паспрыяюць намаганням гэтых дзяржаў належным чынам прыняць беларусаў, якія знайшлі ў іх прытулак ад рэпрэсій і гвалту.

## B. Тлумачальны мемарандум. Дакладчык Поль Галь

### 1. Уступ

1. Колькасць беларусаў, вымушаных пакінуць сваю краіну ў выніку рэпрэсій, развязаных пасля сфальсіфікаваных прэзідэнцкіх выбараў 9 жніўня 2020 г., застаецца нявызначанай. Па розных ацэнках яна складае ад 300 000 да 500 000 чалавек, што, несумненна, з'яўляецца самым вялікім рухам міграцыі ў гісторыі Беларусі пасля Другой сусветнай вайны. Хаця большасць з іх маюць агульнае жаданне — як мага хутчэй вярнуцца ў дэмакратычную Беларусь — не ўсе яны разглядаюць сябе аднолькава. Але незалежна ад таго, з'яўляюцца яны мігрантамі, дыяспарай ці ўцекачамі, беларусы, якія цяпер жывуць за мяжой, сутыкаюцца з агульнымі праблемамі, якія вынікаюць з тых самых прычын, якія прымусілі іх пакінуць сваю краіну. Менавіта таму я выкарыстоўваю ў сваім дакладзе панятак «выгнанне», бо беларусы, якія пакінулі сваю краіну, зрабілі гэта супраць сваёй волі і таму, што знаходжанне ў Беларусі несла сур'ёзную пагрозу для іх жыцця і бяспекі[3].

2. Не ўсе беларусы ў выгнанні з'яўляюцца праваабаронцамі. Становішча апошніх добра засведчанае, у прыватнасці, у нядаўнім каментары камісара Рады Еўропы па правах чалавека, у якім яна прапануе шэраг мер у якасці шляху наперад[4]. Менш вядомае і

[3] У французскай версіі дакладу выкарыстанне 3-й асобы множнага ліку ў мужчынскім родзе таксама адносіцца да жаночага роду.
[4] "Support Russian and Belarusian civil societies and human rights defenders" –

засведчанае становішча іншых катэгорый асоб, якія таксама сутыкаюцца з праблемамі, якія перашкаджаюць ім жыць нармальным жыццём — журналістаў і супрацоўнікаў СМІ, палітычных апанентаў рэжыму, юрыстаў, пісьменнікаў і мастакоў, сваякоў палітвязняў, студэнтаў і навукоўцаў, прадпрымальнікаў і спартсменаў.

3. Першы бар’ер, які мусяць пераадолець беларусы ў выгнанні, — дамагчыся прызнання таго, што беларускае грамадзянства і ідэнтычнасць не робяць іх прадстаўнікамі ці прыхільнікамі рэжыму Лукашэнкі. Грамадскае ўспрыманне стала ключавым фактарам парушэння правоў беларусаў у выгнанні. Выкарыстанне аднаго агульнага падыходу да беларусаў сведчыць аб адсутнасці разумення — і, такім чынам, ацэнкі — іх індывідуальных сітуацый, у выніку чаго ўся супольнасць сутыкаецца з рызыкай дыскрымінацыі і іншых парушэнняў правоў чалавека выключна з-за сваёй нацыянальнасці і меркаваных палітычных прыхільнасцей.

4. Апошнія падзеі ў Беларусі — асабліва ўдзел рэжыму ў вайне супраць Украіны, а таксама падпісанне 6 лютага 2023 г. Аляксандрам Лукашэнкам указу № 25 аб стварэнні спецыяльнай камісіі па працы з «палітычнымі» эмігрантамі, якія хочуць вярнуцца на радзіму, — відавочна паказваюць, што тыя, хто знайшоў бяспеку за мяжой, наўрад ці змогуць вярнуцца на радзіму ў бліжэйшы час[5].

5. Бядотнае становішча беларусаў у выгнанні і цяжкі гуманітарны крызіс у Беларусі былі ў пэўнай ступені адсунутыя на другі план жахлівымі наступствамі расейскай агрэсіі супраць Украіны. Мая справаздача накіраваная на тое, каб асвятліць праблемы, з якімі сутыкаюцца беларусы, іх спецыфічныя патрэбы ў краінах, якія іх прынялі, і, што больш важна, прапанаваць шляхі іх вырашэння, заснаваныя, дзе гэта магчыма, на ўжо дзейнай перадавой практыцы. Я ўважаю, што наша Асамблея можа прапанаваць дзяржавам-удзельніцам Рады Еўропы канкрэтныя рашэнні, каб забяспечыць, што тыя, хто шукае прытулку, змогуць заставацца ў краіне прытулку/выгнання на законных падставах і ў годных умовах у адпаведнасці з іх асноўнымі правамі, гарантаванымі Еўрапейскай канвенцыяй па правах чалавека (ETS № 5), да ўсталявання дэмакратычнага рэжыму ў Беларусі.

6. Падчас падрыхтоўкі гэтага дакладу я быў уражаны мужнасцю, рашучасцю, крэатыўнасцю і трываласцю беларусаў у выгнанні, з якімі я сустракаўся, пачынаючы ад лідаркі дэмакратычных сіл Святланы Ціханоўскай. Я не маю сумневу, што імкненне беларускага народа да дэмакратыі, правоў чалавека і вяршэнства закона, якіх ён быў занадта доўга пазбаўлены, будзе аднойчы неўзабаве рэалізаванае. Я ўважаю, што наш абавязак як суайчыннікаў-еўрапейцаў — дапамагчы ім на гэтым шляху, і спадзяюся, што мой даклад зможа гэтаму паспрыяць.

7. Для падрыхтоўкі гэтага дакладу Камітэт па справах міграцыі, уцекачоў і перамешчаных асоб правёў шэраг абмеркаванняў і ўпаўнаважыў мяне правесці місію па зборы фактаў у Варшаве і Вільнюсе (27-30 сакавіка 2023 г.). Я вельмі ўдзячны ўсім маім суразмоўцам сярод літоўскіх і польскіх улад, а таксама самім беларусам у выгнанні, якія з шчырасцю і энтузіязмам падзяліліся са мной сваімі клопатамі і надзеямі. Я спадзяюся, што мой даклад не толькі перадае іх погляды, але і прапануе канкрэтныя рашэнні, якія дапамогуць ім адбудаваць сваё жыццё ў Еўропе, пакуль у іх краіне яшчэ існуе рэжым, які знішчыў усе грамадзянскія і палітычныя інстытуты. Я прыняў усе меры перасцярогі, каб не ўключыць у даклад інфармацыю, якая магла б паставіць пад пагрозу іх ці іх сваякоў.

8. Святлана Ціханоўская, з якой я сустрэўся ў Вільнюсе, адзначыла важнасць гэтага дакладу і падкрэсліла, што праблемы, з якімі сутыкаюцца беларусы ў выгнанні, застаюцца па-за ўвагай грамадства. Уважлівы падыход да сітуацыі можа дапамагчы зразумець, што беларускі народ не трэба блытаць з мінскім рэжымам. Яна выказала занепакоенасць тым, што пасля расейскай агрэсіі супраць Украіны беларусы ў выгнанні

Commissioner for Human Rights (coe.int).

[5] https://president.gov.by/ru/events/podpisan-ukaz-o-rassmotrenii-obrashcheniy-nahodyashchihsya-za-rubezhom- grazhdan-respubliki-belarus-po-voprosam-sovesheniya-imi-pravonarusheniy.

сутыкнуліся з больш высокай рызыкай дыскрымінацыі, калі не з пагрозай сваёй бяспецы, таму што іх атаясамліваюць з рэжымам, саюзнікам Расейскай Федэрацыі. Яна выказала надзею, што даклад дапаможа зменшыць перашкоды, з якімі сутыкаюцца яе суайчыннікі, паінфармаваўшы краіны-ўдзельніцы Рады Еўропы аб шляхах выпраўлення недахопаў у дзейным заканадаўстве і практыцы прыёму тых беларусаў, якія не самі вырашылі пакінуць сваю краіну, але былі вымушаныя зрабіць гэта гвалтоўным, небяспечным і непрадказальным рэжымам.

## 2. Агульны кантэкст

9. Колькасць беларусаў, якія жывуць за мяжой[6], ацэньваецца па-рознаму ў залежнасці ад крыніц. Паводле «Белсату», 177 000 беларусаў пакінулі краіну ў перыяд з 1995 па 2016 гг., у той час як іншыя крыніцы ацэньваюць гэтую лічбу ад 1,5 да 3,5 мільёнаў пры агульнай колькасці насельніцтва ў 9 349 645 чалавек на 1 студзеня 2021 г.[7]

10. Большасць тых, хто пакінуў сваю краіну пасля прэзідэнцкіх выбараў 2020 г., вырашылі застацца ў суседніх краінах — у Літве і Польшчы. Хаця з-за нерэгулярнасці прыбыццяў і адсутнасці дакладных дадзеных аб міграцыі цяжка вызначыць іх колькасць з пэўнасцю, паводле некаторых ацэнак, у Літве цяпер пражывае каля 49 000 беларусаў і значна больш за 100 000 чалавек пражывае ў Польшчы[8].

11. Паколькі беларусам не патрэбная віза для ўезду ў Грузію, гэтая краіна стала прытулкам для велізарнай хвалі ўцекачоў з Беларусі, якія ратаваліся тут ад дзяржаўных рэпрэсій 2020 г. і расейскай агрэсіі супраць Украіны ў 2022 г. Так, у сакавіку 2022 г. у Грузію з Украіны прыехалі 19 898 беларусаў, з іх засталіся 14 030. У сакавіку 2022 г. у параўнанні з сакавіком 2019 г. уезд грамадзян Беларусі ў Грузію павялічыўся на 555%[9].

12. Многія беларусы ў выгнанні былі вымушаныя пакінуць сваю першую краіну прызначэння з-за візавых праблем, меркаванняў асабістай бяспекі або пачатку вайны ва Украіне. Іншымі словамі, яны перажылі падвойнае або патройнае перамяшчэнне. Згодна з нядаўнім колькасным і якасным аналізам, праведзеным Валдзісам Фугашам, адным з заснавальнікаў праваабарончай арганізацыі Human Constanta і дакладчыкам на паседжанні Камітэту па справах міграцыі, уцекачоў і перамешчаных асоб 24 студзеня 2023 г., сярэдняя колькасць перамяшчэнняў на краіну на групу склала 2,1.

13. Той момант, калі Аляксандр Лукашэнка адмовіўся прызнаць сваю паразу на прэзідэнцкіх выбарах 9 жніўня 2020 г., стаў пачаткам глыбокіх зменаў у беларускім грамадстве і самой краіне. Яго падтрымка Расейскай Федэрацыі ў вайне ва Украіне і ўдзел у гэтай вайне даюць дадатковы доказ таго, што мінскі рэжым існуе не для таго, каб служыць народу Беларусі, а каб абараняць сваё становішча і прывілеі. У той жа час рэжым ставіць пад пагрозу незалежнасць і суверэнітэт Беларусі. Тым часам Святлана Ціханоўская — найбольш верагодная пераможца выбараў, якую вымусілі з'ехаць з Беларусі, узяла на сябе ролю лідара дэмакратычных сіл з усёй адданасцю і кампетэнтнасцю, неабходнымі для такой пасады. Больш як праз два гады пасля выбараў, знаходзячыся ў выгнанні ў Літве, янаператварыла свой офіс і Аб'яднаны пераходны кабінет у дэ-факта ўрад у выгнанні, і з абмежаванымі сродкамі выконвае функцыі, якія не выконваюцца рэжымам Лукашэнкі, для дапамогі сваім суайчыннікам, якія жывуць за мяжой. Сучасныя тэхналогіі дапамагаюць ёй практычна будаваць паралельную дзяржаву да таго часу, як у Беларусі ўсталюецца дэмакратычны рэжым. 6 сакавіка 2023 г. суд у Мінску завочна прысудзіў Ціханоўскую да 15 гадоў пазбаўлення волі.

---

[6] Bipart – The Art of public administration “Civil Society in Belarus in the Context of a Political Crisis: Current State and Challenges Research report”, 2021

[7] Беларусь у лічбах | Афіцыйны Інтэрнет партал Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь (https://president.gov.by/be/belarus/numbers)

[8] Eastern Europe Studies Centre, “Belarusian migrants in Poland and Lithuania: general trends and comparative analysis 2022”, 30 November 2022 and https://news.zerkalo.io/life/36903.html.

[9] https://idfi.ge/ge/border_crossing_statistics_of_citizens_of_ukraine_russia_and_belarus.

14. Выключэнне Расейскай Федэрацыі з Рады Еўропы пасля агрэсіі ва Украіне прымусіла Камітэт міністраў таксама прыпыніць усе адносіны з Беларуссю 17 сакавіка 2022 г.[10] Гэтае рашэнне адчыніла дзверы для абмеркавання супрацоўніцтва з дэмакратычнымі сіламі. Святлану Ціханоўскую запрасілі выступіць на панэльнай дыскусіі высокага ўзроўню, арганізаванай Асамблеяй 21 чэрвеня 2022 г., а праз некалькі тыдняў, 7 ліпеня, выступіць у Камітэце міністраў. З гэтай нагоды яна заклікала Камітэт міністраў да нестандартнага мыслення, усталяваўшы афіцыйны канал сувязі паміж Арганізацыяй і дэмакратычнымі сіламі Беларусі з мэтай "прыцягнуць больш Беларусі ў Еўропу і больш Еўропы ў Беларусь».[11] Гэта прывяло да стварэння Камітэтам міністраў Кантактнай групы па супрацоўніцтве паміж Радай Еўропы і беларускімі дэмакратычнымі сіламі і грамадзянскай супольнасцю, мэтай якой з'яўляецца забеспячэнне падтрымкі і экспертызы Арганізацыі для ўмацавання беларускага дэмакратычнага грамадства ў адпаведнасці з асноўнымі каштоўнасцямі Рады Еўропы. Праца Кантактнай групы ўжо прывяла да публікацыі 1 лютага 2023 г. плана дзеянняў з 15 пунктаў па падтрымцы прадстаўнікоў грамадзянскай супольнасці і дэмакратыі, якія працуюць на карысць будучай свабоднай і дэмакратычнай Беларусі[12].

15. З кастрычніка 2020 г. Еўрапейскі Звяз паступова ўводзіць супраць Беларусі абмежавальныя меры ў адказ на сфальсіфікаваныя прэзідэнцкія выбары ў жніўні 2020 г. Агулам 195 фізічных і 34 юрыдычных асоб патрапілі пад рэжым санкцый у дачыненні да Беларусі, у тым ліку ключавыя фігуры палітычнага кіраўніцтва і ўрада, высокапастаўленыя чыноўнікі судовай сістэмы і некалькі буйных эканамічных суб'ектаў[13]. Еўрапейскі Звяз таксама ўвёў абмежавальныя меры ў дачыненні да Беларусі пасля яе ўдзелу ў ваенным уварванні Расеі ва Украіну 24 лютага 2022 г. Апроч таго, што высокапастаўленыя асобы ў Беларусі пацярпелі ад замарожвання іх актываў і забароны на ўезд, Еўрапейскі Звяз таксама абмежаваў фінансавыя, гандлёвыя і тэхналагічныя стасункі з Беларуссю[14]. 27 лютага 2023 г. Рада Еўрапейскага Звязу прыняла рашэнне падоўжыць дзеянне ўжо ўведзеных санкцый яшчэ на год з-за «няспыннага крызісу ўнутранай сітуацыі ў краіне і працяглага ўдзелу Беларусі ў расейскай агрэсіі супраць Украіны».[15] Таксама з 28 чэрвеня 2021 года Беларусь прыпыніла ўдзел ва «Усходнім партнёрстве».

16. 24 лістапада 2022 г. Еўрапарламент прыняў Рэзалюцыю аб «працяглых рэпрэсіях супраць дэмакратычнай апазіцыі і грамадзянскай супольнасці ў Беларусі», у якой, у прыватнасці, падкрэсліваецца неабходнасць «працягваць дапамогу дэмакратычнай апазіцыі, грамадзянскай супольнасці і праваабаронцам, прадстаўнікам прафсаюзаў і незалежных СМІ ў Беларусі і за мяжой». Еўрапарламент ізноў заклікаў Камісію і дзяржавы-ўдзельніцы «падрыхтаваць правілы і працэдуры для вырашэння сітуацый, калі праваабаронцаў і іншых актывістаў грамадзянскай супольнасці пазбаўляюць грамадзянства ў Беларусі, а таксама аказаць падтрымку тым беларусам, якія пражываюць у ЕЗ, у якіх заканчваецца тэрмін дзеяння пашпартаў, і якія не маюць магчымасці іх падоўжыць, бо не могуць вярнуцца ў Беларусь»[16].

17. Шмат гадоў адзіным міжнародным механізмам абароны беларусаў былі звароты ў Камітэт па правах чалавека ААН. Гэты шлях стаў немагчымым пасля выхаду Беларусі з гэтай працэдуры ў лістападзе 2022 г.[17] Тым не менш, тыя беларусы, якія апынуліся

---

[10] "Committee of Ministers suspends relations with the Belarusian authorities" – Portal (coe.int).

[11] "Стварыць кіруючы камітэт па сувязях з Беларуссю". Святлана Ціханоўская звярнулася да Камітэта міністраў Рады Еўропы / Афіцыйны сайт Святланы Ціханоўскай.

[12] «Рада Еўропы запускае план дзеянняў па падтрымцы беларускіх дэмакратычных сіл і грамадзянскай супольнасці» – Дырэкцыя каардынацыі праграм (coe.int).

[13] "Belarus: EU prolongs restrictive measures for a year" – Consilium (europa.eu).

[14] "Belarus' role in the Russian military aggression of Ukraine: Council imposes sanctions on additional 22 individuals and further restrictions on trade" – Consilium (europa.eu).

[15] "Belarus: EU prolongs restrictive measures for a year" – Consilium (europa.eu).

[16] Texts adopted – "The continuing repression of the democratic opposition and civil society in Belarus" – 24 November 2022 (europa.eu).

[17] www.ohchr.org/en/press-releases/2022/11/belarus-withdrawal-individual-complaints-procedure-serious-setback- human.

пад юрысдыкцыяй любой з 46 дзяржаў-удзельніц Рады Еўропы, знаходзяцца пад абаронай паводле Артыкула 1 Еўрапейскай канвенцыі па правах чалавека.

18. Спецыяльны дакладчык ААН па Беларусі Анаіс Марын у сваім апошнім дакладзе Генеральнай Асамблеі ААН засяродзіла ўвагу на «сітуацыі з правамі чалавека грамадзян Беларусі, якія вымушаныя пакінуць сваю краіну і не могуць бяспечна вярнуцца дадому з-за парушэнняў правоў чалавека”[18]. Яна правяла грунтоўны аналіз асоб і груп, якія дзейны рэжым вымусіў пакінуць радзіму, і я запрашаю ўсіх, хто цікавіцца гэтым пытаннем, прачытаць яе грунтоўны даклад. Я таксама меў шанец сустрэцца з ёй падчас сваёй місіі і вельмі ўдзячны за дадатковую інфармацыю і разуменне сітуацыі, якія дала мне гэтая сустрэча.

### 3. Становішча беларусаў у выгнанні

19. Беларуская дыяспара мае разнастайны характар. Да 2020 г. у дыяспары існавалі арганізацыі розных накірункаў, з іх некаторыя прасоўвалі прынцыпы дэмакратыі, а іншыя былі лаяльныя да мінскага рэжыму. У той жа час пераважная большасць беларусаў, якія ўцяклі пасля выбараў 2020 г., — дэмакратычна арыентаваныя, і многія з іх, у тым ліку тыя, хто не займаўся грамадзянскім рухам у Беларусі, сталі дэ-факта актывістамі ў выгнанні.

20. Паэт у выгнанні Дзмітрый Строцаў наведаў сакратарыят Асамблеі з нагоды паездкі ў Страсбург, каб прэзентаваць французскі пераклад сваёй апошняй паэтычнай кнігі[19]. Перад гэтым ён выступіў на сваёй старонцы ў Фэйсбуку з заклікам да беларусаў у выгнанні падзяліцца сваімі сведчаннямі. Толькі за некалькі гадзін ён атрымаў больш за 50 паведамленняў, якія абапіраліся на асабісты досвед і ахоплівалі праблемы, акрэсленыя ў гэтым дакладзе.

21. Уласны досвед Дзмітрыя Строцава дэманструе некаторыя з кафкіянскіх сітуацый, з якімі сутыкаюцца беларусы ў выгнанні. Зараз ён жыве ў Германіі. Ён не змог працягнуць тэрмін дзеяння нямецкай візы ці атрымаць новую, бо Германія патрабавала ад яго вярнуцца ў краіну, якая першая выдала яму візу, а менавіта ў Швецыю. Але каб атрымаць шведскую візу, яму трэба было б пакінуць Еўразвяз. Урэшце спадар Строцаў атрымаў візу ў Літве дзякуючы арганізацыі Freedom House, якая за яго паручылася. Атрымаць такую гарантыю ад няўрадавай арганізацыі магчыма ў Літве, дзе Міністэрства замежных спраў адмыслова дэлегавала арганізацыі Freedom House ролю паручальніка і дзе знаходзіцца офіс Святланы Ціханоўскай. У іншых краінах Рады Еўропы такой магчымасці няма. Гэты асобны прыклад добра адлюстроўвае тое, што я пачуў падчас сваіх размоваў з беларусамі ў выгнанні, абмеркаванняў з сябрамі камітэту і падчас маёй місіі па зборы фактаў.

22. Іншыя формы дыскрымінацыі могуць адбывацца ў выглядзе абраз і пагроз, адмовы ў паслугах, цяжкасці ў атрыманні медычнай дапамогі і належнага жылля, працаўладкаванні або адкрыцці банкаўскага рахунку. Паводле нядаўняга колькаснага аналізу, 39% апытаных беларусаў у выгнанні ў Грузіі, 31% — у Польшчы, і 16% — у Літве пацвердзілі, што зазналі розныя формы дыскрымінацыі ў краінах прызначэння, асабліва ад пачатку расейскай агрэсіі супраць Украіны. Такія выпадкі зафіксаваныя і ў іншых дзяржавах-удзельніцах Рады Еўропы[20].

23. Гэтая дыяспара сутыкаецца з мноствам праблем юрыдычнага і практычнага характару, якія вынікаюць з заканадаўства, адміністрацыйных працэдур або практыкі ў краінах знаходжання. Гэтыя праблемы могуць пачацца з самага нараджэння, як у выпадку з дзецьмі, народжанымі ў бацькоў, якія знаходзяцца ў рэжыме часовай візы: яны не могуць атрымаць беларускія дакументы і таму фактычна з'яўляюцца непаўналетнімі асобамі без дакументаў і рызыкуюць застацца без грамадзянства. Іншыя праблемы, звязаныя з важнымі жыццёвымі падзеямі, такімі як нараджэнне, шлюб ці развод, а

[18] A/77/195 (undocs.org).
[19] *Où j'étais pendant les quinze dernières années. Je criais*, Le Ver à soie, 2023.
[20] 19509.pdf (fes.de).

таксама з штодзённымі клопатамі, такімі як замена беларускага пасведчання кіроўцы са скончаным тэрмінам дзеяння.

24. Беларускія жанчыны ў выгнанні могуць сутыкацца з большай колькасцю форм дыскрымінацыі і перашкод на шляху інтэграцыі, чым беларускія мужчыны за мяжой. У асноўным гэтыя перашкоды звязаныя з цяжкасцямі ў пошуку працы, легалізацыі свайго статусу, вывучэнні мясцовай мовы або доступу да медычных паслуг. Часам іх фінансавая залежнасць ад мужа яшчэ больш узмацняе гэтыя перашкоды[21].

25. Беларусы настроеныя ў першую чаргу дапамагчы сабе самі. Пакуль я пішу гэты даклад, закладаюцца асновы для пабудовы лічбавай дзяржавы для Беларусі, у якой дактары, юрысты, школьныя настаўнікі і г.д., звольненыя рэжымам, могуць быць нанятыя для аказання паслуг онлайн. Гэта таксама дазволіла б палепшыць доступ да незалежных сродкаў масавай інфармацыі ў Беларусі і распрацаваць інструменты для пашырэння паслуг малога бізнесу. Гэтыя ініцыятывы дазволяць ствараць дыстанцыйныя працоўныя месцы для людзей у Беларусі і за яе межамі.

26. Папраўка ў Закон «Аб грамадзянстве Рэспублікі Беларусь» ад 10 студзеня 2023 г., падпісаная Аляксандрам Лукашэнкам, якая ўступае ў сілу 10 чэрвеня 2023 г., робіць магчымым пазбавіць грамадзянства асобу, якая пражывае за мяжой і якой беларускі суд вынес канчатковы прысуд за «экстрэмісцкую» дзейнасць або іншыя дзеянні, якія пагражаюць бяспецы дзяржавы. Рашэнні па такіх пытаннях будзе асабіста прымаць сам Лукашэнка. З выкананнем гэтага заканадаўства многія беларусы ў выгнанні сутыкнуцца з рызыкай застацца без грамадзянства. Гэта створыць асаблівыя цяжкасці для беларусаў, якія жывуць у такіх краінах, як Польшча, якая не ратыфікавала Канвенцыю аб статусе асоб без грамадзянства 1954 г. або Канвенцыю аб скарачэнні безграмадзянства 1961 г.[22] У сваіх заўвагах ад снежня 2022 г. Вярхоўны камісар ААН па пытаннях уцекачоў зрабіў наступныя рэкамендацыі: пазбаўленне грамадзянства не павінна прыводзіць да безграмадзянства, што ёсць прынцыпам міжнароднага права і абароны правоў чалавека, які павінен выконвацца дзяржавамі, нават калі яны, як Беларусь, не з'яўляюцца ўдзельніцамі канвенцый ААН аб безграмадзянстве[23]. Трэба адзначыць, што Беларусь тым не менш паабяцала далучыцца да абедзвюх канвенцый ААН аб безграмадзянстве на Сегменце высокага ўзроўню па пытаннях безграмадзянства ў 2019 г.[24]

27. 21 траўня 2021 г. Міжнароднае партнёрства па правах чалавека (IPHR), Нарвежскі Хельсінкскі камітэт, Global Diligence LPP і Truth Hounds накіравалі ў Міжнародны крымінальны суд (МКС) Паведамленне ў адпаведнасці з артыкулам 15(2) Рымскага статуту пад назвай «Сітуацыя ў Беларусі/Літве/Польшчы/Латвіі і Украіне: злачынствы супраць чалавечнасці ў выглядзе дэпартацыі і пераследу»[25]. Паведамленне запытвае, каб пракурор МКС распачаў расследаванне сітуацыі ў Беларусі, і ў прыватнасці таго факту, што рэжым гвалтоўна перасяліў тысячы мірных жыхароў краіны за яе межы шляхам гвалту, запалохвання і іншых формаў прымусу. Нягледзячы на тое, што Беларусь не з'яўляецца дзяржавай-удзельніцай МКС, МКС мае юрысдыкцыю ў дачыненні да злачынстваў, прадугледжаных Рымскім статутам, якія адбываюцца — прынамсі, часткова, — на тэрыторыі суседніх з ёй дзяржаў. Паведамленне запытвае, каб пракурор МКС пачаў папярэдняе вывучэнне сітуацыі ў Беларусі (а таксама ў Літве,

---

[21] Вольга Кавальская, "Жыццё ў выгнанні --- даклад па беларускіх жанчынах за мяжой", *New Eastern Europe*, 31 May 2022.

[22] Упраўленне Вярхоўнага камісара ААН па пытаннях уцекачоў (УВКУ ААН) – Канвенцыі ААН аб безграмадзянстве (unhcr.org) і Канвенцыя аб скарачэнні безграмадзянства 1961 г. (un.org).

[23] "UNHCR Observations on the proposed amendments to the 'Law on citizenship of the Republic of Belarus'", Refworld, 1 September 2002, No. 136-3. ["Заўвагі УВКУ ААН адносна прапанаваных паправак у "Закон аб грамадзянстве Рэспублікі Беларусь"", *Refworld*, 1 верасня 2002 г., № 136-3].

[24] Вынікі Сегмента высокага ўзроўню па пытаннях безграмадзянства (unhcr.org).

[25] "Сітуацыя ў Беларусі: злачынствы супраць чалавечнасці ў выглядзе дэпартацыі і пераследу" – IPHR (iphronline.org).

Польшчы, Латвіі і Украіне) з мэтай расследавання і судовага пераследу меркаваных злачынстваў. Гэты запыт пакуль застаецца без адказу.

28. Нацыянальныя парламенты ў Еўропе і за яе межамі адыгралі значную ролю ў падтрымцы дэмакратычных сіл Беларусі. Многія парламентарыі, у тым ліку дэпутаты нашай Асамблеі, сталі «хроснымі бацькамі» палітвязняў. Акрамя таго, усё большая колькасць нацыянальных парламентаў — на сённяшні дзень 17 — такіх краін як Бельгія, Эстонія, Грузія, Францыя, Латвія, Літва і Украіна засноўваюць групы сяброўства з дэмакратычнымі сіламі Беларусі. Ствараецца сетка, каб аб'яднаць іх і каардынаваць іх намаганні.

### *3.1. Легальны ўезд і пражыванне*

*3.1.1. Доступ да візы*

29. Атрыманне візы для паездак у краіны ЕЗ заўсёды было праблемай для беларусаў. Масавыя рэпрэсіі пасля фальшывых выбараў 2020 года пагоршылі дыпламатычныя адносіны паміж Еўразвязам і рэжымам. Гэта прывяло да скарачэння персаналу ў некаторых амбасадах дзяржаў-удзельніц ЕЗ, што абмежавала іх здольнасць разглядаць візавыя заяўкі.

30. Калі пасля выбараў пачаліся масавыя рэпрэсіі, некаторыя суседнія краіны адкрылі свае межы для ўцекачоў, нягледзячы на працяглую пандэмію Covid-19, а часам і ў адсутнасць дзейнай візы. Гэтак, Літва адкрыла гуманітарны калідор, праз які беларусаў прапускалі без візы, пасля таго як Freedom House — арганізацыя, якую фінансуе ЗША, — перадала ў МЗС ваўчар-гарантыю для зацікаўленых асоб, а той, у сваю чаргу, паінфармаваў адпаведныя пункты памежнага кантролю. Freedom House працягвае паручацца ад імя Міністэрства замежных спраў за тых, хто хоча атрымаць візы і часовыя дазволы [26] . Праверкі праводзяцца ў супрацоўніцтве з беларускімі няўрадавымі арганізацыямі, такімі як Human Constanta, Беларускі Хельсінкскі Камітэт і «Вясна». Не ўсе, хто звяртаецца ў Freedom House па ваўчар, могуць яго атрымаць. Літва істотна скароціць выдачу віз пасля ўступлення ў сілу законаў аб абмежавальных мерах, накіраваных на абарону нацыянальнай бяспекі і знешнепалітычных інтарэсаў Літвы (гл. ніжэй).

31. Польшча мае на мэце па-ранейшаму заставацца адкрытай для беларусаў. Улады адрозніваюць менскі рэжым ад тых, хто не падтрымлівае Лукашэнку. Аднак пасля высылкі польскіх дыпламатаў аб'ектыўна зменшыліся магчымасці выдачы віз у Мінску і двух польскіх консульствах у Брэсце і Гродна. Паводле статыстыкі Міністэрства замежных спраў Польшчы, з 10 жніўня 2020 г. па 31 снежня 2022 г. Польшча выдала беларусам 509 701 візу. У 2022 г. было выдадзена 278 181 віза, з якіх 259 427 былі тыпу D (унутраныя візы) і 18 754 тыпу C (шэнгенскія візы). Рэпрэсіі супраць беларускіх грамадзян, якія належаць да польскай меншасці, абвастрылі напружанасць паміж дзвюма краінамі і прывялі да таго, што толькі адзін памежны пункт у Тэрэспалі застаецца адкрытым для фізічных асоб, у той час як пункты для грузавых перавозак былі зачыненыя польскім бокам[27].

32. Што тычыцца іншых еўрапейскіх краін, большасць з іх ужо скарацілі свае консульскія магчымасці да чэрвеня 2021 г.[28] Краіны Рады Еўропы, у якія не патрабуецца віза для ўезду, — гэта Арменія, Азербайджан, Грузія, Турцыя і Украіна. Гэтай акалічнасцю, а таксама частковай адсутнасцю моўнага бар'еру тлумачыцца тое, чаму так шмат беларусаў выязджала ў Грузію і Украіну (гл. ніжэй).

33. Паводле Аб'яднанага пераходнага кабінету Беларусі, з пачаткам вайны супраць Украіны некаторыя дзяржавы-удзельніцы ўвялі новыя абмежаванні ў дачыненні да беларускіх грамадзян. У Латвіі, Літве, Эстоніі, Фінляндыі, Польшчы, Нарвегіі і Швецыі

[26] Freedom House | Пашырэнне свабоды і дэмакратыі.
[27] Асабліва пасля таго, як Анджэй Пачобут, дзеяч польскай меншасці, быў зняволены на 8 гадоў за распальванне варожасці.
[28] Генеральная Асамблея ААН, A/77/195, "Даклад спецдакладчыка па сітуацыі з правамі чалавека ў Беларусі, Анаіс Марэн", 20 ліпеня 2022 г., с. 6.

шэнгенскія візы не выдаюцца або права на іх атрыманне абмежаванае, у тым ліку для блізкіх сваякоў, якія пражываюць у Еўрапейскім Звязе. Візы ў Данію і Чэхію не выдаюцца. Візы ў Аўстрыю, Нідэрланды, Партугалію, Іспанію і Швецыю можна атрымаць толькі ў Маскве. Францыя, Германія, Грэцыя і Італія выдаюць візы пасля доўгага чакання (да 6-8 месяцаў), з празмернымі зборамі, якія трэба заплаціць афіцыйна прызначаным пасярэднікам (да 450 еўра) і на кароткі тэрмін, напрыклад, на 15 дзён[29].

34. Некаторыя краіны па-ранейшаму ўважаюць Беларусь бяспечнай краінай. Напрыклад, Швецыя не абнаўляла свой даклад па Беларусі з 2019 г. і ўважае Беларусь бяспечнай краінай. У выніку беларусаў могуць вярнуць назад у Беларусь, альбо адмовіць ім у статусе ўцекача. Беларусы ў Германіі таксама паведамляюць, што чуюць ад чыноўнікаў, што яны могуць спакойна вярнуцца ў Беларусь.

35. Нарэшце, строгі візавы рэжым, які дзейнічае для грамадзян Беларусі, перашкаджае ўз'ядананню сем'яў, таму што адсутнічаюць спецыяльныя механізмы, якія б спрыялі такому ўз'яднанню. Яшчэ менш існуе магчымасцей для сваякоў наведаць на кароткатэрміновай аснове членаў сваёй сям'і, якія жывуць за мяжой. Многія з маіх суразмоўцаў скардзіліся на тое, што ўз'ядананне сям'і немагчымае па гуманітарнай візе, і можа адбыцца толькі па шэнгенскай візе, якую цяжка атрымаць, і тое толькі на 90 дзён. У некаторых краінах, такіх як Германія, для атрымання візы патрабуецца дазвол арэндадаўцаў. Людзі адчуваюць сябе закладнікамі выпадковых сітуацый, якія перашкаджаюць ім карыстацца правам на сямейнае жыццё.

36. Увогуле, шанцы беларусаў перасяляцца за межы Беларусі і свабодна перасоўвацца па краінах Еўразвязу значна зменшыліся пасля 2020 г., у той час як патрэба ў гэтым цяпер як ніколі значная.

### *3.1.2. Легалізацыя пражывання*

37. Калі яны з'язджалі пасля выбараў, большасць беларусаў думалі, што вернуцца праз пару тыдняў, мяркуючы, што, як дыктуе розум, дэмакратыя возьме верх. Яны не ўлічвалі рашучасці Лукашэнкі любым коштам утрымаць уладу і той дапамогі, якую яму прадставіць Уладзімір Пуцін (і якая будзе каштаваць краіне страты яе суверэнітэту). Аднак праз нейкі час стала зразумела, што іх выгнанне можа зацягнуцца і што ім трэба легалізаваць сваё знаходжанне за мяжой. Мая праца над гэтым дакладам дазваляе мне зрабіць дзве відавочныя высновы. Па-першае, чым больш часу праходзіць, тым больш аддаленыя перспектывы вяртання беларусаў на радзіму, асабліва пасля 24 лютага 2022 г. Па-другое, чым бліжэй краіны знаходзяцца да Беларусі, тым лепш яны разумеюць праблемы беларусаў у выгнанні і тым больш яны гатовыя адаптаваць свае заканадаўства і практыку, каб прыняць тых, хто ўцякае ад гвалту рэжыму Лукашэнкі.

38. Такім чынам, можна знайсці добрыя практыкі легалізацыі ў Літве і Польшчы, дзе пражывае найбольшая колькасць беларусаў у выгнанні, і ўлады якіх добра разумеюць, «якая гэта навала мець такога непрадказальнага суседа», як сказаў мне адзін з літоўскіх суразмоўцаў. Нагадаем, што Беларусь знаходзіцца менш чым за 40 км ад Вільні.

39. Літва ўвяла спрыяльныя візавыя ўмовы пасля выбараў 2020 г., прадставіўшы 6-месячныя бясплатныя візы, гуманітарныя дазволы для ахвяр палітычных рэпрэсій, а таксама нацыянальныя візы, якія даюць права на часовы дазвол на пражыванне. Таксама была спрошчаная працэдура рэлакацыі прадпрыемстваў (пераважна IT), што дазволіла перамясціць ў Літву ўсіх супрацоўнікаў.

40. Колькасць беларусаў, якія пражываюць у Літве, у апошнія гады няўхільна расце: у 2020 годзе іх было 18 000, у 2021 г. — 31 000, у 2022 г. — 49 000. Ёсць тры падставы для іх легальнага знаходжання: з дазволам на працу, па гуманітарных прычынах і са статусам уцекача. Да кожнага статусу далучаныя розныя правы. Вельмі мала беларусаў — толькі 160 — падаліся тут на статус ўцекача з-за працэдуры, якая доўжыцца ад 12 да 15

[29] Неафіцыйнв даклад падрыхтаваны Аб'ядналым пераходным кабінетам Беларусі, люты 2023 г.

месяцаў і цягам якой нельга працаваць. Дазвол на часовае пражыванне трэба працягваць кожны год, і гэта грувасткая і дарагая працэдура, якая фактычна перашкаджае свабодзе перамяшчэння, бо да яе далучаецца пашпарт замежніка.

41. Мае беларускія суразмоўцы падкрэслілі, што Літва прадэманстравала вялікую салідарнасць з беларусамі, якія мусілі ўцякаць з-за таго, што абаранялі дэмакратыю і правы чалавека, прыняўшы іх пасля сфальсіфікаваных выбараў. Аднак новы законапраект адносна прыняцця абмежавальных санкцый у выніку агрэсіі Расеі супраць Украіны, які абмяркоўваўся падчас майго візіту ў Вільнюс, выклікаў у іх глыбокую занепакоенасць. Для іх новыя абмежаванні значылі, што «беларускі народ і мінскі рэжым паклалі ў адзін кошык». Беларусы Літвы непакоіліся, бо ўспрынялі законапраект літаральна як рэакцыю на сваё знаходжанне ў Літве. Адзін з іх перадаў гэта пытаннем: «За што Літва нас карае, у чым мы вінаватыя?»

42. Прадстаўнікі Міністэрства ўнутраных спраў, з якімі я сустракаўся ў Вільнюсе, запэўнілі мяне, што ўлады не маюць на мэце абцяжарыць жыццё тым людзям, якія супрацiўляюцца мінскаму рэжыму і знайшлі прытулак у Літве, жывуць, вучацца і працуюць там, але што яны павінны былі прыняць меры для захавання нацыянальнай бяспекі пасля расейскай агрэсіі супраць Украіны. Для іх расейскі і беларускі рэжымы аднолькава адказныя за вайну ва Украіне.

43. 20 красавіка 2023 г., адхіліўшы вета прэзідэнта, Сейм Літвы прыняў Закон аб абмежавальных мерах, накіраваных на абарону нацыянальнай бяспекі Літвы і знешнепалітычных інтарэсаў[30]. Папярэдні праект устанаўліваў сур'ёзныя абмежаванні для беларусаў у дачыненні да магчымасці атрымання візы, дазволу на жыхарства, грамадзянства, электроннага статусу рэзідэнта і электроннага подпісу.

44. Закон з папраўкамі, унесенымі Сеймам, у рэшце рэшт не закрануў тых беларусаў, якія ўжо жывуць у Літве. Хутчэй, ён увёў абмежаванні для грамадзян Беларусі, якія не пражываюць у Літве. Такім чынам, ён больш не прадугледжвае падачы заявак на атрыманне візы ў літоўскіх візавых службах за мяжой, за выключэннем выпадкаў пасярэдніцтва Міністэрства замежных спраў; не прадугледжвае атрыманне нацыянальнай візы праз знешняга пастаўшчыка паслуг за мяжой (гэта абмежаванне ўступае ў сілу 1 ліпеня 2023 г.) і падачу заявы на электронны статус рэзідэнта (за выключэннем тых, хто мае дазвол на пастаяннае або часовае пражыванне ў Літве). Такім чынам, новае заканадаўства закране тых, хто толькі збіраецца прыехаць у Літву, у тым ліку сваякоў тых, хто ўжо пражывае ў Літве.

45. На сустрэчы, якая адбылася 5 красавіка 2023 г., Міністэрства ўнутраных спраў і офіс Святланы Ціханоўскай дамовіліся стварыць рабочую групу для спрашчэння працэдур і вырашэння іншых практычных пытанняў беларусаў у Літве. Тое, што офіс Святланы Ціханоўскай фізічна знаходзіцца побач, несумненна, спрыяе вырашэнню патэнцыйных праблем на самым пачатку.

46. Такая адмысловая каманда па вырашэнні праблем беларусаў у выгнанні ў Польшчы ўжо існуе з сакавіка 2022 г. Падчас майго візіту ў Варшаву Міністэрства ўнутраных спраў дало мне падрабязную інфармацыю і статыстычныя дадзеныя. У польскае заканадаўства і практыку былі ўнесеныя змены, якія дазваляюць беларусам, якія ратуюцца ад рэжыму, заставацца і легальна працаваць у Польшчы. Са студзеня 2023 г. беларусам, якія прыехалі ў Польшчу па гуманітарнай візе, дазволена легалізаваць іх далейшае знаходжанне на падставе дазволу на часовае пражыванне.

47. Гэта адкрыла магчымасць для выдачы ім польскага падарожнага дакумента замежніка, які звычайна выдаецца замежнікам, якія знаходзяцца ў Польшчы на падставе бестэрміновага дазволу на жыхарства ў сітуацыі, калі іх падарожны дакумент быў страчаны, знішчаны, або ў яго скончыўся тэрмін дзеяння, і няма магчымасці атрымаць новы праязны дакумент[31].

48. Больш за тое, згодна з Законам ад 9 сакавіка 2023 г. аб унясенні зменаў у Закон аб замежніках і некаторыя іншыя законы, з 1 чэрвеня 2023 г. магчымасць выдачы гэтага дакумента будзе адкрытая таксама для беларусаў, якія знаходзяцца ў Польшчы на

[30] XIV-1868 Lietuvos Respublikos ribojamųjų priemonių dėl karinės agresijos prieš Ukrainą nustatymo įstatymas (lrs.lt).
[31] Закон аб замежніках. Артыкул 186, частка 1, пункт 9.

падставе любога часовага дазволу на жыхарства, дадатковую абарону або дазволу на жыхарства па гуманітарных прычынах. Дакумент тэрмінам дзеяння на адзін год будзе выдавацца ваяводам[32] бясплатна.

49. Польшча і Літва — адзіныя краіны, якія прынялі спецыяльныя законы ў сувязі з вялікай колькасцю новапрыбылых беларусаў. Тым не менш, іх намаганні і добрая воля не знялі ўсіх клопатаў і перашкод, з якімі даводзіцца сутыкацца беларусам. Што тады можна сказаць пра тых, хто жыве ў іншых краінах Рады Еўропы, дзе няма глыбокага разумення сітуацыі ў Беларусі? У большасці з іх адсутнічае заканадаўства, якое спрыяла б легалізацыі беларусаў на гуманітарных падставах, на якіх яны ўехалі ў Еўразвяз, альбо якое давала б магчымасць легальнага пражывання на падставе вучобы або працы, у тым ліку для высокакваліфікаваных спецыялістаў.

50. Ніколі нельга забываць, што гэтыя людзі з’ехалі з сваёй краіны таму, што ў іх не было іншага выбару. Многія сутыкнуліся з турмамі, катаваннямі і пагрозамі. Яны маюць адно жаданне: вярнуцца на радзіму, каб пабудаваць новую дэмакратычную дзяржаву. Пакуль жа яны вымушаныя жыць за мяжой, краіны знаходжання павінны як мага больш аблегчыць ім жыццё. Ёсць шмат прыкладаў, калі адкладзены ад’езд экспертаў, актывістаў, журналістаў, праваабаронцаў, якія не жадалі пакідаць радзіму, заканчваўся арыштамі і працяглымі тэрмінамі зняволення.

*3.1.3. Ці прасіць статус уцекача?*

51. Вельмі мала беларусаў у выгнанні папрасілі статус уцекача, бо яны не жадаюць разрываць сувязі з роднай краінай, якую пакінулі не па сваёй волі. Атрыманне статусу ўцекача мае і практычныя наступствы, напрыклад, немагчымасць продажу нерухомасці ў Беларусі.

52. Для прыкладу, у Польшчы, дзе існуе вельмі ліберальны рэжым прадстаўлення міжнароднай абароны, з 9 жніўня 2020 г. па 31 снежня 2022 г. па міжнародную абарону звярнуліся 5775 беларусаў. Гэта складае толькі 5% беларусаў, якія хадайнічаюць аб рознага кшталту дазволах на жыхарства ў Польшчы. Больш за 99% запытаў былі прынятыя, астатнія ж былі адхіленыя, сыходзячы з меркаванняў бяспекі. У Польшчы зарэгістравана каля 70% заявак ад грамадзян Беларусі на абарону ў Еўропе. Літва і Германія задаволілі каля 10% астатніх запытаў.

53. Але для тых, хто жадае атрымаць міжнародную абарону, нацыянальныя правілы і працэдуры часта ператвараюць разгляд заявы ў доўгі працэс, цягам якога яны не маюць права на працу. У Літве, жыццё ў якой для беларусаў дарагое, падчас працэдуры атрымання статусу ўцекача, якая доўжыцца больш за год, некаторыя, каб выжыць, вымушаныя выкарыстоўваць нелегальныя спосабы заробку, нягледзячы на імкненне выконваць закон і плаціць падаткі.

54. У такіх краінах, як Францыя, Іспанія і Партугалія, атрымаць статус уцекача практычна немагчыма, бо адпаведныя ўлады не ведаюць сітуацыі ў Беларусі. Супрацоўнік міграцыйнай службы аднойчы спытаў заяўніка: «А ў чым праблема з Беларуссю?»[33]. Пакуль нацыянальныя ўлады і дзяржаўныя чыноўнікі, якія займаюцца іміграцыйнымі заявамі ад беларускіх заяўнікаў, не будуць ведаць пра жахлівую сітуацыю ў Беларусі, сітуацыя наўрад ці палепшыцца.

### *3.2. Пагрозы свабодзе перасоўвання*

55. Свабода перасоўвання — гэта вельмі адчувальная праблема, якая закранае многіх беларусаў замежжа. Нават тыя, хто выконвае неабходныя патрабаванні для выезду за мяжу, праз некаторы час сутыкаюцца з практычнай праблемай: альбо дзеянне іх пашпарту заканчваецца, альбо ў ім не стае старонак для штампу. Мы, грамадзяне Шэнгенскай зоны, амаль забыліся пра даўно мінулую практыку ставіць штамп у пашпарце пры кожным перасячэнні мяжы, але калі мы згадаем, што гэта значыць, мы

[32] Губернатар вобласці.

[33] Абмеркаванне 15 сакавіка 2023 г.

зразумеем, наколькі важныя пустыя старонкі ў дзейным пашпарце.

56. Гэтая сітуацыя не тычыцца тых грамадзян Беларусі, якія знаходзяцца пад міжнароднай абаронай і маюць так званы «жэнеўскі пашпарт», і тых, хто мае дазвол на часовае пражыванне і пашпарт замежніка з такім жа тэрмінам дзеяння, як, напрыклад, у Літве і Польшчы. Аднак такія асобы складаюць меншасць.

57. Ёсць шмат неафіцыйных сведчанняў пра тое, што беларускія консульствы за мяжой адхіляюць запыты аб працягу тэрміну дзеяння пашпартоў сваіх грамадзян. Замест гэтага яны патрабуюць, каб тыя вярнуліся ў Беларусь і атрымалі новы падарожны дакумент. Гэта, вядома, немагчыма для ўсіх тых, хто ўцёк ад існуючага рэжыму. Ужо было занадта шмат прыкладаў, калі беларусаў арыштоўвалі па вяртанні, нягледзячы на «спеў сірэны», якім рэжым Лукашэнкі заваблівае іх вярнуцца. Рэжым відавочна выкарыстоўвае кантроль над пашпартамі як інструмент кантролю над жыццём тых, хто жыве за мяжой. Такая практыка таксама дэ-факта з'яўляецца адмовай рэжыму Лукашэнкі аказваць адну з асноўных паслуг дзяржавы – выдаваць дакументы сваім грамадзянам.

58. Гэтая залежнасць шкодзіць беларусам, якія жывуць за мяжой, якія паказалі, што не жадаюць траціць свайго грамадзянства. Іх пашпарты не павінны выкарыстоўвацца ўладамі як інструмент кантролю над іх жыццём.

59. Можна было б дазволіць беларускім грамадзянам працягваць карыстацца іх падарожнымі дакументамі, нават калі іх тэрмін дзеяння скончыўся. Аднак Еўразвяз ставіцца вельмі асцярожна да выдачы падарожных дакументаў і іх праўдзівасці. Дакументы таксама павінны адпавядаць строгім патрабаванням Міжнароднай арганізацыі грамадзянскай авіяцыі (МАГА) па бяспецы падарожжаў. Акрамя таго, працяг тэрміну дзеяння падарожнага дакумента з'яўляецца надзвычай працаёмкай і далікатнай задачай у Еўрапейскім Звязе. Гэта супярэчыць правілам МАГА, якія дзейнічаюць ва ўсім свеце і не прадугледжваюць адступленняў.

60. У адказ на патрабаванне беларусаў не рабіць іх закладнікамі нелегітымнага рэжыму, які перашкаджае ім карыстацца свабодай перамяшчэння, офіс Святланы Ціханоўскай і Аб'яднаны пераходны кабінет Беларусі выступілі з ідэяй стварэння новага беларускага пашпарту, які будзе выдадзены пад іх эгідай і кантролем. Гэтая ініцыятыва звязаная з вялікай колькасцю палітычных, практычных, фінансавых праблем, а таксама з пытаннямі бяспекі, але трэба памятаць пра ўнікальнасць цяперашняй сітуацыі, калі дэ-факта ствараецца беларуская дзяржава ў выгнанні. Таму гэтае пытанне патрабуе нестандартнага рашэння, і я мяркую, што дзяржавы-ўдзельніцы Рады Еўропы, а таксама Еўрапейскі Звяз маглі б знайсці арыгінальныя спосабы падтрымаць гэтыя намаганні.

### *3.3. Адмова ў консульскіх паслугах*

61. Беларусам таксама адмаўляюць у консульскіх паслугах у тых выпадках, калі неабходны апастыль, асабліва ў працэсе легалізацыі. Мне паведамілі, што пасля чакання ў доўгіх чэргах людзям альбо не даюць адказу на іх запыт, або кажуць, што ім трэба вярнуцца ў Беларусь, што для іх, вядома, немагчыма, бо, як было сказана вышэй, там ім адразу пагражаў бы арышт.

62. Асаблівую заклапочанасць выклікаюць дзеці, народжаныя за мяжой, якія не могуць атрымаць дакументы, таму што консульства не можа займацца гэтым пытаннем. Праз тое, што іх бацькі не ў стане вярнуцца ў Беларусь для афармлення адпаведных дакументаў, існуе рызыка таго, што дзеці, народжаныя за мяжой, могуць застацца без грамадзянства.

63. У сітуацыі, калі рэжым працягвае выкарыстоўваць гэты рычаг уплыву на сваіх грамадзян, а краіны, у якіх знаходзяцца беларусы, патрабуюць дакументы, якія фактычна немагчыма атрымаць, беларусы ў выгнанні альбо вымушаныя вярнуцца і рызыкаваць быць арыштаванымі па палітычных прычынах, альбо застаюцца ў гэтых краінах, не ў стане легалізаваць сваё пражыванне, атрымаць прызнанне сваіх дыпломаў і пазбаўленыя доступу да сацыяльных і медычных паслуг. З боку еўрапейскіх краін патрабаваць апастыль ад непрызнанага рэжыму ёсць супярэчнасцю, і трэба

знайсці рашэнні, каб пазбегнуць неабходнасці звароту да консульскіх служб гэтай краіны.

### *3.4. Пагрозы бяспецы*

64. Для тых беларусаў, якія ўцяклі ад рэжыму, перасячэнне мяжы не заўсёды дае гарантыю бяспекі, але яшчэ большая рызыка для бяспекі існуе ў тых, хто застаўся. Беларусь відавочна ператварылася ў вялізную турму пад адкрытым небам, дзе мішэнню можа стаць кожны за выключэннем тых, хто застаецца верным рэжыму. Беларусам у выгнанні цяжка падтрымліваць адносіны са сваякамі і сябрамі, якія засталіся ў краіне, менавіта таму, што кантакт можа паставіць іх пад пагрозу. Многія з маіх суразмоўцаў падкрэслівалі, што адной з праблем з'яўляецца аднаўленне сувязі беларусаў за межамі краіны з тымі, хто ўсё яшчэ знаходзіцца ў ёй.

65. Простыя зносіны ператвараюцца ў сапраўдную праблему. Французскі сацыёлаг Раман Эрвуэ ў сваёй апошняй кнізе падае цудоўны і кранальны прыклад, калі распавядае пра сваё ліставанне са старым сябрам, які ўсё яшчэ жыве ў Мінску і адчувае сябе, як альбатрос у Шарля Бадлера, «у выгнанні на зямлі»[34].

66. Усе беларусы ў эміграцыі баяцца спрабаваць вярнуцца на радзіму, бо любая іх публічная заява ці асабістае паведамленне могуць быць выкарыстаныя, каб абгрунтаваць іх затрыманне. Кожны дзень у Беларусі арыштоўваюць каля 15-20 чалавек, а толькі ў 2022 г. было зарэгістравана 5 тысяч палітычна матываваных затрыманняў. Аднак беларусы ў выгнанні баяцца не толькі за ўласныя жыцці, але і за любыя магчымыя расправы з боку дзяржавы над іх сваякамі, якія ўсё яшчэ знаходзяцца на беларускай тэрыторыі. Калі беларусам у выгнанні завочна прысуджаюць турэмны тэрмін або грамадзянскія санкцыі, улады прымаюць любыя меры, якія ўважаюць неабходнымі, каб прымусіць іх вярнуцца ў Беларусь для неадкладнага арышту. Напрыклад, сустракаліся выпадкі выкрадання або затрымання сваякоў беларусаў у выгнанні[35]. Часам сваякоў катуюць, каб прымусіць іх даць інфармацыю пра беларусаў замежжа. У іншых выпадках дамы ці кватэры беларусаў у выгнанні былі разбураныя або ў іх праводзіліся вобшукі дзеля таго, каб знайсці доказы для выкарыстання ў судовых працэсах, а ў офісах няўрадавых арганізацый рабіліся ператрусы ў якасці пагрозы[36].

67. Арганізацыі, якія падтрымліваюць актывістаў і сем'і палітвязняў, праз аказанне ім фінансавай падтрымкі ўнутры краіны, павінны дзейнічаць вельмі асцярожна, каб пазбегнуць рызыкі арышту для атрымальнікаў. Некаторыя з іх былі прызнаныя «экстрэмісцкімі арганізацыямі», а калі беларускія банкі апублікавалі спіс асоб, якія рабілі ахвяраванні праз гэтыя арганізацыі, іх таксама абвясцілі экстрэмістамі, што прывяло да арыштаў і шантажу.

68. Ёсць дастаткова гучных выпадкаў, якія паказваюць адсутнасць належнай лічбавай бяспекі. Напрыклад, інфармацыя з кампутара і тэлефона журналіста Рамана Пратасевіча было выкарыстаная ў якасці доказу для яго арышту і судовага пераследу пасля прымусовай пасадкі рэйса Ryanair Афіны-Вільня ў красавіку 2021 г.

69. Я чуў дзве розныя гісторыі пра кнігу «Я выходжу», якая змяшчае здымкі дэманстрацый пасля выбараў 9 жніўня 2020 г.[37]: першая — што гэтыя здымкі выкарыстоўваюцца ўладамі для ідэнтыфікацыі і арышту апанентаў рэжыму, а фотаздымкі разглядаюцца як

---

[34] Ronan Hervouet*, La Révolution suspendue, les Bélarusses contre l'Etat autoritaire*, Plein Jour, 2023.

[35] Павел Слункін, «Турма розуму: пагоня Лукашэнкі за выгнанымі беларусамі», Еўрапейская рада па міжнародных адносінах, 30 студзеня 2023 г.; гл. таксама Генеральная Асамблея ААН, A/77/195, там жа, с. 10-12.

[36] Генеральная Асамблея ААН, A/77/195, там жа, с. 13.

[37] https://euroradio.fm/ru/v-minske-semeynuyu-paru-osudili-za-protesty-po-foto-iz-knigi.

доказ іх удзелу ў дэманстрацыях супраць Лукашэнкі; і другая, адваротная, — што Freedom House выкарыстоўвае гэтыя фатаграфіі як доказы таго, што тыя, хто імкнецца ўехаць у Літву, з'яўляюцца сапраўднымі апанентамі рэжыму, а не інфільтраванымі агентамі.

70. Цяжка сказаць, наколькі беларускія спецслужбы актыўныя за мяжой, але я чуў з розных крыніц, што павялічваецца выкарыстанне ілжывых і дыскрэдытацыйных наратываў супраць актывістаў, што спрыяе, між іншым, стварэнню пачуцця недаверу паміж рознымі арганізацыямі.

71. У адным выпадку літоўскі адвакат быў абвінавачаны ў тым, што КДБ завербаваў яго для шпіянажу за арганізацыяй, якая базуецца ў Вільні[38]. Мне таксама паведамілі пра выпадкі, калі беларусы ў эміграцыі былі завербаваныя КДБ Беларусі ў абмен на бяспечнае вяртанне ў Беларусь і зняцце з іх магчымых абвінавачанняў. Паводле адной з крыніц, толькі ў снежні 2022 г. 58 беларусаў у выгнанні былі арыштаваныя пасля ўезду ў Беларусь, нягледзячы на тое, што ўлады абяцалі ім бяспечнае вяртанне[39].

72. Крымінальныя працэсы, распачатыя ў Беларусі супраць палітычных апанентаў, могуць мець велізарныя наступствы для жыцця беларусаў у выгнанні, калі Інтэрпол выдасць ім «чырвонае паведамленне» на запыт рэжыму Лукашэнкі. Было ўжо шмат выпадкаў, калі крымінальныя справы распачыналіся як падстава для палітычнага пераследу. Напрыклад, судовы пераслед за меркаваныя эканамічныя злачынствы, такія як нявыплата падаткаў, хабар, махлярства і адмыванне грошай, выкарыстоўваецца для пераследу палітычных апанентаў як унутры Беларусі (прынамсі 15 палітычных зняволеных былі асуджаныя паводле адпаведных артыкулаў Крымінальнага кодэкса, сярод іх — Нобелеўскі лаўрэат Алесь Бяляцкі) так і за межамі краіны (Дзмітрый Глейзер быў абвінавачаны ў атрыманні хабару, але быў вызвалены судом у Славеніі)[40]. Акрамя таго, крымінальныя справы па абвінавачанні ў стварэнні пагрозы нацыянальнай бяспецы, экстрэмізме, дзяржаўнай здрадзе, распальванні нацыянальнай варожасці, парушэнні грамадскага парадку і г. д. былі распачатыя супраць палітычных апанентаў і журналістаў, якія пратэстуюць супраць вайны ва Украіне[41].

73. Пасля ўнясення зменаў у заканадаўства з траўня 2022 г. смяротнае пакаранне можа быць прысуджанае не толькі за здзяйсненне тэрарыстычнага акту, але і за падрыхтоўку да яго. У спісе так званых тэрарыстаў у Беларусі фігуруюць удзельнікі пратэстаў 2020 г., у тым ліку Святлана Ціханоўская і Павал Латушка. У 2022 г. людзей затрымалі за дыверсію на чыгунцы, мэтай якой было не пусціць расейскія вайсковыя цягнікі ва Украіну. Большасць затрыманых былі абвінавачаныя альбо ў тэрарыстычным акце, альбо ў падрыхтоўцы да яго.

74. Беларусы ў выгнанні могуць адчуваць сябе ў бяспецы толькі тады, калі дакладна ведаюць, што ім не пагражае экстрадыцыя як наступства «чырвонага паведамлення» Інтэрполу. Такім чынам, ключавое значэнне мае прадстаўленне належнай інфармацыі адпаведным нацыянальным органам, якім адрасаваныя гэтыя «чырвоныя паведамленні». Міністэрствы юстыцыі і ўнутраных спраў павінны сістэматычна знаёміцца з адпаведнымі справаздачамі, якія будуць абгрунтоўваць адмоўны адказ на «чырвонае паведамленне» Інтэрполу або на запыт аб экстрадыцыі[42]. У сувязі з гэтым

---

[38] Наш дом, “Напады беларускіх і расейскіх спецслужбаў на тэрыторыі Літоўскай Рэспублікі на беларускіх жанчын, праваабаронцаў, журналістаў і актывістаў у выгнанні”, 24 кастрычніка 2022.
[39] Наш дом, “Новая Берлінская сцяна ў Еўропе: нябачныя беларускія ўцекачы паміж Мінскам і Вільняй”, 1 сакавіка 2023 г.
[40] www.24ur.com/novice/slovenija/slovenska-policija-pridrzala-belorusa-na-katerega-je-razpisana-tiralica.html.
[41] www.dw.com/ru/10-sutok-za-zhelto-golubye-cvety-kak-sudili-belorusov-zaderzhannyh-za-akcii-protiv-vojny/ a-61001758; https://humanconstanta.org/obzor-borby-s-ekstremizmom-v-belarusi-za-oktyabr-dekabr-2022/; https://prisoners.spring96.org/ru/person/vjaczaslau-lazarau.

[42] Больш поўную інфармацыю можна знайсці ў наступных дакументах: Даклад

варта адзначыць, што Беларусь з'яўляецца адзінай еўрапейскай краінай, дзе запыт аб выдачы Інтэрполу не патрабуе рашэння суда; пракуратура выкарыстоўвае гэтую шчыліну для пераследу палітычных апанентаў.

### *3.5. Салідарнасць з Беларуссю*

75. Сувязі паміж беларусамі ў выгнанні і іх суайчыннікамі, якія не пакінулі краіну, застаюцца вельмі моцнымі нават пры адсутнасці фізічных кантактаў. Сацыяльныя сеткі і сучасныя тэхналогіі адыгрываюць тут важную ролю. У Беларусі існуе шмат ініцыятыў, накіраваных на падтрымку розных груп насельніцтва. Я не буду складаць іх спіс, бо яны заслугоўваюць асобнага даклада[43].

76. Намеснік старшыні «Вясны», віцэ-прэзідэнт Міжнароднай федэрацыі правоў чалавека (МФПЧ) і шматгадовы партнёр Рады Еўропы па адмене смяротнага пакарання Валянцін Стэфановіч, асуджаны на 9 гадоў калоніі, напісаў у красавіку 2023 г.: «Увязненне падобнае на смерць… Можа, ты і не памёр, але ты надоўга выкрэслены з жыцця, і жыццё, яно ідзе, працягваецца, але без цябе. Але я цвёрда маю намер усё гэта вытрымаць і вярнуцца ў гэты свет»[44].

77. Ва ўмовах штодзённага павелічэння колькасці палітычных зняволеных надзвычайна важна падтрымліваць іх, а таксама іх сваякоў. Акрамя жаху самога зняволення, палітвязням даводзіцца перажыць шмат цяжкасцей пасля вызвалення. Спіс розных відаў неабходнай матэрыяльнай падтрымкі бясконцы: ад ежы да грошай (для аплаты рахункаў за газ і электрычнасць, назапашаных за перыяд зняволення), адзення, лекаў і г.д. Каб мець магчымасць падтрымаць усіх, хто мае патрэбу, неабходны рэгулярны прыток ахвяраванняў. Тут трэба ўлічваць таксама і тое, што ў 2023-2024 гг. павінна выйсці на волю ад 300 да 400 палітвязняў, асуджаных пасля выбараў на 2-3 гады пазбаўлення волі.

78. У палітвязняў пасля вызвалення часта парушанае псіхічнае і фізічнае здароўе, і велізарныя намаганні робяцца, каб забяспечыць іх вяртанне ў грамадства. Мне паведамілі, што з-за кепскіх умоў утрымання многія страцілі зубы, і іх замена разглядаецца як важны крок да рэсацыялізацыі[45].

79. Яшчэ адна катэгорыя асоб, якія маюць патрэбу ў падтрымцы суайчыннікаў за мяжой, гэта тыя, хто былі звольненыя з працы і апынуліся без крыніцы пастаяннага даходу, напрыклад, лекары і настаўнікі.

80. Для пераадолення перашкод, звязаных з праблемамі бяспекі, банкаўскімі правіламі і санкцыямі, укараняюцца бяспечныя альтэрнатывы для пераводу грошай у Беларусь. Аб'ём грошай, сабраных на дапамогу, розныя прыярытэты і канкурэнтныя ініцыятывы выклікалі пэўную напружанасць у адносінах паміж некаторымі беларускімі няўрадавымі арганізацыямі ў выгнанні.

---

дакладчыка АБСЕ у рамках Маскоўскага механізма у сувязі з паведамленнямі пра парушэнні правоў чалавека ў кантэксце прэзідэнцкіх выбараў 9 жніўня 2023 г. у Беларусі (https://www.osce.org/ru/odihr/469542); Даследаванне сітуацыі з правамі чалавека ў Беларусі Вярхоўнага камісара ААН па правах чалавека (https://www.ohchr.org/en/hr-bodies/hrc/ohchr-belarus/index); Спіс дзеянняў, за якія беларускія грамадзяне могуць быць асуджаныя па крымінальным артыкуле (https://spring96.org/files/misc/actions-for-which-belarusian-citizens-can-be-held-criminally-liable.pdf); Выпадкі палітычнага пераследу беларускіх актывістаў праз звароты ў Інтэрпол (https://docs.google.com/document/d/1RL_gz72BGKCujquDdGDkjJZoGBbNHXxI/edit).

[43] Глядзі, напрыклад, https://inicyjatyva.com/initiatives.

[44] Валянцін Стэфановіч, «Я цвёрда маю намер усё гэта вытрымаць і вярнуцца ў гэты свет» (spring96.org).

[45] https://bysol.org/ru/private/formerpoliticalprisonerinneed.

### *3.6. Доступ да адукацыі*

81. Вымушаныя ўцякаць з краіны без папярэдняй падрыхтоўкі да выезду, многія беларусы часта пакідалі свае дыпломы і не ставілі апастыль на прафесійныя пасведчанні. Таму адсутнасць афіцыйных дакументаў стала істотнай перашкодай для доступу беларусаў у выгнанні да кваліфікаванага рынку працы або адукацыйных праграм. Да таго ж, не ведаючы мясцовай(-ых) мовы(-аў) і маючы патрэбу ў адаптацыі да новых умоў, беларусам у выгнанні часта бывае цяжка знайсці адпаведныя школы для сваіх дзяцей.

82. Выпадкі дыскрымінацыі зафіксаваныя таксама ў школах і ўніверсітэцкіх колах. У прыватнасці, еўрапейскія ўніверсітэты часам адмаўлялі беларусам у магчымасці паступлення, напрыклад, з меркаванняў бяспекі. У некаторых універсітэтах абмяркоўваецца магчымае выключэнне ўжо залічаных студэнтаў-беларусаў[46].

83. Вучні гімназіі імя Францішка Скарыны маюць шанец вучыцца ў адзінай за межамі Беларусі дзесяцікласнай школе, дзе навучанне вядзецца на беларускай мове. Яны вучацца па літоўскай праграме, але на сваёй мове. У гімназіі, упершыню адчыненай ў 1919 г., зачыненай ў 1944 г. і зноў адчыненай ў 1994 г., сёлета навучаецца 381 вучань, палова з якіх прыехала пасля выбараў 2020 г. Акрамя роднай і літоўскай моваў, яны вывучаюць англійскую і рускую[47]. Некаторыя з настаўнікаў самі з'яўляюцца беларусамі ў выгнанні. Для вучняў гэтай гімназіі інтэграцыя не стварае праблемы, у адрозненне ад іншых школ, дзе беларускія вучні мусяць адаптавацца да новай мовы і новай праграмы. У Польшчы ў гэтым навучальным годзе некаторыя беларусы займаліся ў адаптацыйных класах разам з украінскімі дзецьмі, што ў шэрагу выпадкаў выклікала напружанасць і эпізоды цкавання. Таксама мне паведамілі, што заняткі, якія праводзяцца для беларускай нацыянальнай меншасці ў Польшчы, закрытыя для новапрыбылых беларусаў.

84. З-за таго, што беларуская навука і акадэмічны свет гадамі існавалі ў ізаляцыі, кіруючыся ўласнымі крытэрыямі, беларускія навукоўцы амаль ніколі не маглі ўдзельнічаць у міжнародных навуковых праектах. У выніку яны не маюць сувязей са сваімі калегамі за мяжой, іх рэзюмэ не адпавядаюць патрабаванням акадэмічных устаноў за межамі Беларусі, і ім складана дамагчыся прызнання іх дыпломаў. Гэта стварыла цяжкасці з пераездам і працаўладкаваннем для навукоўцаў у выгнанні.

85. Пачынаючы ад гэтага году, юнакі, якія вучацца за мяжой, больш не будуць мець адтэрміноўкі ад вайсковай службы. Гэта значыць, што студэнты, якім споўнілася 18 гадоў, павінны пайсці ў войска і змогуць вярнуцца вучыцца толькі праз два гады. У выпадку, калі яны вырашаюць застацца ў сваім універсітэце, дзяржава будзе разглядаць гэта як ухіленне ад вайсковай службы. Еўрапейскі гуманітарны ўніверсітэт — адзіны беларускі ўніверсітэт, які грунтуецца на прынцыпах акадэмічнай свабоды і прыхільнасці да еўрапейскіх каштоўнасцей і які знаходзіцца ў Вільнюсе з 2005 г., — асабліва занепакоены тым, што візы і дазволы на жыхарства ў гэтых маладых людзей скончацца, калі яны скончаць навучанне.

### *3.7. Прафесійная кар'ера ў выгнанні*

86. У дадатак да структурных бар'ераў, беларускія ўцекачы часта адчуваюць дыскрымінацыю па нацыянальнай прыкмеце на працы. Яны паведамляюць пра выпадкі, калі ім павялічвалі працоўную нагрузку, пра іх распаўсюджвалі ілжывую інфармацыю і ім адмаўлялі ў працаўладкаванні[48]. Паводле нядаўняга колькаснага аналізу, 17%

[46] Еўрапейскі студэнцкі звяз, “BM81: Рэзалюцыя аб недапушчальнасці дыскрымінацыі супраць студэнтаў з Беларусі”, 15 ліпеня 2022 г. P. Skorinos Gymnasium (skorinosgimnazija.lt).
[47] P. Skorinos Gymnasium (skorinosgimnazija.lt).
[48] Oleg Alampiyev and Philipp Bikanau, “Belarusians in Poland, Lithuania, Georgia: attitude to the war, help to Ukraine, discrimination”, Friedrich Ebert Stiftung, August 2022, p. 17; Volha Kavalskaya, “Life in exile – a report on Belarusian women abroad”, *New Eastern Europe*, 31 May 2022.

апытаных беларусаў у выгнанні ў Польшчы сутыкаліся з адмовай у працаўладкаванні[49].

*3.7.1. Бізнес*

87. Больш за 80% беларускіх кампаній у выгнанні знаходзяцца ў Польшчы дзякуючы Poland Business Harbour. Яшчэ 10% знаходзяцца ў Літве, а астатнія — у іншых краінах свету, асабліва ў Грузіі з вялікай колькасцю малых прадпрыемстваў і самазанятых асоб.
88. Перамяшчэнне за мяжу IT-кампаній звычайна праходзіла паспяхова. Напрыклад, сярод трох галоўных IT-кампаній Літвы дзве — беларускія. Аднак большасць перамешчаных беларускіх прадпрыемстваў прыпадае на рознічны гандаль, лагістыку і транспарт, дробныя паслугі, а таксама будаўніцтва.
89. Міжнародныя санкцыі супраць рэжыму Лукашэнкі віталіся дэмакратычнымі сіламі. Аднак гэтыя ж санкцыі таксама паўплывалі на дзейнасць прадпрыемстваў, якія належаць беларусам, якія з'ехалі з краіны і не звязаныя з мінскім рэжымам[50].
90. Самая вялікая праблема, з якой сутыкаюцца гэтыя прадпрыемствы — гэта адкрыццё банкаўскага рахунку. Нягледзячы на тое, што два польскія банкі гатовыя адкрываць рахункі для такіх прадпрыемстваў, у тым выпадку, калі заяўка будзе адхіленая, прадпрыемства будзе занесенае ў чорны спіс, а новая заяўка фактычна запатрабуе стварэння новай кампаніі. Акрамя таго, часовыя адрасы не прымаюцца, што стварае асаблівую праблему для IT-кампаній, якія часта працуюць у вандроўным рэжыме. Сітуацыю таксама ўскладняе абмежаванне па дэпазітах, якое закранае тых, хто хоча перавесці сродкі ад продажу нерухомасці ў Беларусі ў краіну, дзе яны знаходзяцца. Гэта тычыцца не толькі прадпрыемстваў, але і тых палітвязняў, якія выйшлі на волю і з'ехалі з краіны.
91. Беларускія кампаніі менш канкурэнтаздольныя, таму што ім цяжка атрымаць крэдыт або бухгалтарскія паслугі. Больш за тое, у некаторых краінах, напрыклад, у Эстоніі ці Латвіі, беларусам практычна немагчыма стаць уласнікамі кампаніі, і таму мясцовыя акцыянеры становяцца асноўнымі ўласнікамі акцый.
92. Асацыяцыя беларускага бізнесу за мяжой (ABBA), створаная ў 2021 г., аказвае падтрымку беларускім прадпрыемствам, якія жадаюць пераехаць або ўжо пераехалі за мяжу[51]. Была распрацаваная сістэма акрэдытацыі, паводле якой кампаніі, якія жадаюць далучыцца да Асацыяцыі, павінны падпісаць кодэкс бізнес-этыкі, пацвердзіўшы, што яны выступаюць супраць вайны ва Украіне і падтрымліваюць дэмакратычныя каштоўнасці. Трое з сябраў Асацыяцыі ўваходзяць у каманду Святланы Ціханоўскай па эканоміцы і ўдзельнічалі ў Давоскім форуме ў 2023 г., каб прадставіць патрэбы беларускага прыватнага сектару ў выгнанні. Нягледзячы на тое, што Асацыяцыя цалкам падтрымлівае санкцыі ЕЗ супраць Беларусі, яна ўважае, што неабходна падтрымліваць тых, хто выступае супраць рэжыму Лукашэнкі, і дазваляць ім плаціць падаткі ў тых краінах, дзе яны знаходзяцца.

*3.7.2. Журналісты*

93. Беларуская асацыяцыя журналістаў (БАЖ) — прафесійнае аб’яднанне журналістаў незалежных СМІ, створанае ў 1995 г. для абароны свабоды слова, свабоды інфармацыі, прасоўвання прафесійных стандартаў журналістыкі, правядзення маніторынгу беларускай прэсы і аказання прававой падтрымкі ўсім супрацоўнікам СМІ[52]. Ад 400 да 500 з 1300 сябраў Асацыяцыі пакінулі краіну пасля перагрусаў у офісах БАЖ у лютым 2021 г. У жніўні 2021 г. Вярхоўны суд Беларусі задаволіў пазоў Мінюста аб яе ліквідацыі, але Асацыяцыя, безумоўна, працягвае дзейнічаць у эміграцыі. У сакавіку 2023 г. БАЖ і

---

[49] Oleg Alampiyev and Philipp Bikanau (2022), *op. cit*., p. 13.
[50] «З'явілася мапа беларускага бізнесу за мяжой». Беларускія навіны, charter97.org і www.txtreport.com/business/2022-02-23-belarus-business-harbor-in-baltics-business-forum-takes-place-in-vilnius.ryiV22ml5.html.
[51] ABBA — Асацыяцыя беларускага бізнесу за мяжой (Association of Belarusian Business Abroad, abbabusiness.org).
[52] Беларуская асацыяцыя журналістаў | baj.by.

яе супрацоўнікі былі прызнаныя ўладамі «экстрэмісцкімі фармаваннямі»[53].

94. Большасць журналістаў у выгнанні знаходзяцца ў Грузіі (каля 50), Германіі (ад 20 да 30), Літве (каля 150) і Польшчы (больш за 200). Яны працуюць на беларускія СМІ, і іх галоўная мэта — прадстаўленне аб'ектыўнай і праверанай інфармацыі ўнутры Беларусі для таго, каб зламаць машыну дзяржаўнай прапаганды. Для тых, хто яшчэ не быў зняволены, як тыя 33 журналісты, якія сядзяць за кратамі, працаваць незалежным журналістам у Беларусі стала немагчыма, бо гэта нясе з сабой залішне высокую рызыку[54].

95. Журналісты сутыкаюцца з тымі ж праблемамі, што і іншыя іх суайчыннікі, з пункту гледжання легалізацыі, доступу да банкаўскіх рахункаў і г.д. Часта здараецца, што іх заробкі блакуюць да таго часу, пакуль яны не пройдуць праверкі на адмыванне грошай. Цягам гэтага часу яны не маюць доступу да свайго заробку.

96. Намаганням беларускіх журналістаў за мяжой інфармаваць сваіх суайчыннікаў, безумоўна, вельмі спрыяла б, калі б пошукавыя сістэмы, такія як Google, размяшчалі ў верхняй частцы пошуку іх незалежныя навіны, а не навіны з афіцыйных беларускіх крыніц. Невялікі памер беларускага рынку не павінен перашкаджаць буйным IT-кампаніям рабіць свой унёсак у забеспячэнне справядлівага і бяспечнага Інтэрнэту ў самой Беларусі, дазваляючы распаўсюджваць незалежную і аб'ектыўную інфармацыю.

*3.7.3. Адвакаты*

97. Адвакаты — прафесійная катэгорыя, якая ў Беларусі знаходзіцца пад асаблівай пагрозай. На іх скіраваны цэлы шэраг нападаў з боку рэжыму: злоўжыванне дысцыплінарнымі працэдурамі; адвольнае затрыманне і крымінальны пераслед; прызнанне іх чатаў у Telegram «экстрэмісцкімі»; умяшанне ў канфідэнцыйную камунікацыю паміж адвакатам і кліентам; пазбаўленне іх ліцэнзіі на адвакацкую практыку.

98. У выніку многія з іх былі вымушаныя пакінуць Беларусь і зараз апынуліся ў выгнанні. У дадатак да патрэбы легалізацыі, галоўнай праблемай для беларускіх адвакатаў з'яўляецца прызнанне іх ліцэнзіі на практыку ў краіне знаходжання. Нягледзячы на тое, што гэтая праблема не мае простага і відавочнага рашэння, прызнанне Беларускай асацыяцыі адвакатаў правоў чалавека — новага тыпу асацыяцыі адвакатаў, створанай на тэрыторыі іншых дзяржаў — магло б дазволіць адвакатам у выгнанні працягваць аказваць юрыдычныя паслугі сваім кліентам у Беларусі. Галоўная мэта Асацыяцыі — прасоўванне і абарона правоў чалавека адвакатаў, пазбаўленых права займацца сваёй прафесіяй у Беларусі, а таксама павышэнне стандартаў прававой дапамогі.

99. Даклад «Крызіс адвакатуры ў Беларусі: як вярнуць права на абарону», ініцыяваны Цэнтрам канстытуцыяналізму і правоў чалавека ЕГУ ў партнёрстве з праектам «Права на абарону» (defenders.by), праваабарончай арганізацыі “Human Constanta” і Польскага Хельсінкскага фонду правоў чалавека змяшчае цікавую “Праграму дзеянняў па аднаўленні інстытута адвакатуры ў Беларусі” і, такім чынам, з’яўляецца каштоўнай дарожнай картай на будучыню[55].

***3.8. Захаванне беларускай ідэнтычнасці і культуры***

100. Беларуская мова і культура шмат гадоў знаходзіліся ў ценю расейскай. Нават сама назва не была належным чынам транслітараваная на замежныя мовы, бо не рабілася адрозненне паміж паняткам «руський / рускі», якое абазначала народы, мовы, культуры і рэлігію ўсходніх славян у часы Русі, і тэрмінам «російський / расейскі», які пазначае сёння народ, мову, культуру і Расейскую дзяржаву. Такім чынам, у многіх краінах па-

[53] www.hrw.org/news/2023/03/10/belarus-equates-rights-protection-extremism.
[54] Рэпрэсіі супраць журналістаў і медыя у 2023 годзе, спіс зняволеных | baj.by.
[55] “Крызіс прафесіі адваката ў Беларусі: як вярнуць права на абарону?” [Цэнтр канстытуцыяналізма і правоў чалавека (cchr.online)].

ранейшаму прынята памылкова называць Беларусь «Belorussia» або «White Russia» замест Belarus і Belarusian, што з'яўляецца правільнай транслітарацыяй словаў «Беларусь» і «беларускі» на англійскую мову.

101. Палітычны крызіс, які паўстаў пасля выбараў 2020 г., прывёў да адраджэння цікавасці да беларускай мовы і культуры сярод беларусаў у эміграцыі, у той час як гэтыя мова і культура прыціскаліся ў самой Беларусі. Так, многія мастакі і пісьменнікі, якія далучыліся да масавых пратэстаў пасля выбараў, былі затрыманыя па адміністрацыйных або крымінальных справах. Рэжым увёў цэнзуру і забараніў публікацыю асобных кніг, якія былі прызнаныя экстрэмісцкімі, напрыклад, кніг лаўрэаткі Нобелеўскай прэміі па літаратуры Святланы Алексіевіч.[56]

102. Каб садзейнічаць вывучэнню беларускай мовы, гісторыі і культуры, быў распачаты шэраг ініцыятыў, у прыватнасці ў Беларускім моладзевым Хабе. Мэта Хабу — забяспечыць, каб беларусы, якія вернуцца ў Беларусь, паехалі туды, назапасіўшы больш ведаў і кампетэнцый.[57] Прыярытэтам Беларускага моладзевага хабу з'яўляецца захаванне і ўмацаванне беларускай ідэнтычнасці сярод беларусаў на эміграцыі і іх дзяцей. Акрамя моўных і музычных заняткаў, адной з паспяховых ініцыятыў з’яўляецца стварэнне беларускамоўных мультфільмаў, даступных на YouTube.

103. Беларуская Рада культуры — гэта няўрадавая арганізацыя, якая аб'ядноўвае дзеячаў культуры для фармавання ўстойлівай інфраструктуры свабоднай беларускай культуры. Дзейнасць Рады накіраваная на прасоўванне беларускай культуры (мецэнацкая падтрымка мастакоў, актораў і арт-менеджэраў), распрацоўку новых культурніцкіх праектаў, аб'яднанне культурніцкай супольнасці і прамоцыю беларускай культуры ў свеце. Рада рыхтуе для Еўракамісіі дарожную мапу па захаванні беларускай культуры, створаную з мэтай акрэсліць патрэбы беларускай грамадзянскай супольнасці ў сферы культуры, патлумачыць, чаму задавальненне гэтых патрэб адпавядае інтарэсам еўрапейскіх грамадзян, і рэкамендаваць донарам як дзейнічаць — колькі грошай трэба выдзеліць на гэтую сферу, як лепш структураваць дапамогу і якіх вынікаў можна чакаць. Маецца на мэце, што гэтая прапанова будзе ўлічаная ў праграмным перыядзе Еўрапейскай Камісіі на наступныя тры гады.[58]

104. Тым часам у Беларусі беларуская літаратура і кнігі на беларускай мове практычна вынішчаныя. З мэтай данесці да чытача беларускую літаратуру і павялічыць колькасць перакладаў кніг на беларускую мову робяцца намаганні, каб стварыць у замежжы Інстытут беларускай кнігі. Шэраг аўтараў, ілюстратараў і выдаўцоў абмяркоўваюць статус такой арганізацыі, якая на пачатковым этапе мела б форму пляцоўкі. Практычныя праблемы паўстаюць перад ініцыятарамі стварэння Інстытуту, напрыклад, адсутнасць памяшкання для захоўвання кніг, але першая з гэтых праблем — фінансавая: якім інвестарам будзе цікава ўкладаць грошы ў вельмі маленькі рынак беларускай кнігі?

105. Культура не павінна кіравацца рынкам; яе нельга перавесці ў лічбы ў табліцы Excel. Культуру вельмі важна падтрымліваць, каб тэатры маглі ставіць п’есы, музыкі маглі граць, каб кнігі друкаваліся і чыталіся, з тым каб мастацтва стала цэментам беларускай ідэнтычнасці, а беларуская мова і культура зноў знайшлі сваё месца пад сонцам як ключавыя фактары беларускай дзяржаўнасці.

### *3.9. Падвойнае выгнанне пасля ўцёкаў з Украіны*

106. Украіна была адной з тых краін, якія прынялі вялікую колькасць беларусаў, што адбылося ў вялікай ступені дзякуючы бязвізаваму рэжыму і адсутнасці сур'ёзнага моўнага бар'еру. Было падлічана, што ад 20 000 да 30 000 беларусаў штомесяц перасякалі мяжу пры выездзе з Беларусі ва Украіну пасля выбараў 2020 года, а ў 2021 годзе ва Украіне пражывала каля 171 000 беларусаў. Мне паведамілі, што ад пачатку расійскай агрэсіі супраць Украіны каля 50 000 з іх выехалі ў Польшчу, вялікая колькасць – у Грузію і Літву, і што, магчыма, 5 000 яшчэ застаюцца ва Украіне.

---

[56] Генеральная Асамблея ААН, A/77/195, там жа, p. 16.

[57] ДАПАМАЖЫ ЎЦЕКАЧАМ! (byhub.org).

[58] Беларуская Рада Культуры (byculture.org).

107. Першапачаткова беларусам было дазволена знаходзіцца ва Украіне на працягу 90 дзён, але пасля правядзення кампаніі з боку арганізацый грамадзянскай супольнасці гэты тэрмін быў падоўжаны да 180 дзён, а потым ізноў падоўжаны праз год.[59] Нягледзячы на складаны працэс легалізацыі, большасць беларусаў, якія да вайны жылі ва Украіне, добра інтэграваліся і не збіраліся з'язджаць. Яны былі вымушаныя з’ехаць з Украіны ў выніку расейскага нападу.

108. Як і іншыя грамадзяне трэціх краін, якія ўцяклі з Украіны, гэтыя беларусы не атрымалі доступу да такой жа працэдуры абароны і прыёму, якая прадстаўляецца ўкраінскім грамадзянам Дырэктывай ЕС 2001/55/ЕС (Дырэктыва аб часовай абароне), і апынуліся ў сітуацыі падвойнага выгнання.

109. Аднак некаторыя беларусы засталіся ва Украіне, каб дапамагаць украінцам супрацьстаяць расейскай агрэсіі, у прыватнасці полк імя Кастуся Каліноўскага і іншыя.

110. На момант пачатку вайны ва Украіне ў эміграцыі знаходзілася каля 100 беларускіх журналістаў. Большасць з іх з’ехала, але засталася частка карэспандэнтаў, якія асвятляюць вайну для беларускіх СМІ ў эміграцыі, такіх як «Белсат», «Наша Ніва» і «Зеркало». Мне паведамілі пра вельмі канкрэтную праблему, якая закранае тых журналістаў, якія жывуць ва Украіне; іх банкаўскія рахункі былі заблакаваныя ўкраінскімі спецслужбамі, СБУ, і яны не мелі доступу да сваіх грошай. З таго часу каля паловы гэтых рахункаў было разблакавана, але каля 50-ці іншых па-ранейшаму застаюцца недаступнымі для сваіх уладальнікаў. Розныя спробы звярнуцца ад іх імя да ўкраінскіх улад пакуль не мелі поспеху. Я спадзяюся, што калі рахункі будуць належным чынам правераныя і ў іх не знойдзецца парушэнняў, яны стануць даступнымі для сваіх уладальнікаў, якія знаходзяцца ў сітуацыі падвойнага выгнання і таму маюць яшчэ большую патрэбу ў доступе да ўласных рэсурсаў.

111. Удзел рэжыму Лукашэнкі ў вайне ва Украіне, пагроза бяспецы, якую ён стварае для Украіны і за яе межамі сваёй згодай размясціць на тэрыторыі Беларусі расейскую тактычную ядравую зброю, не павінны разглядацца як апраўданне для правядзення дыскрымінацыйных мер у дачыненні да беларусаў, і асабліва да тых, хто пакінуў краіну з палітычных прычын, у выніку сітуацыі, за якую яны не нясуць адказнасці. Беларусы не шкадавалі сваіх намаганняў, каб падтрымаць украінцаў, у прыватнасці праз збор сродкаў, які праводзіўся арганізацыямі ў выгнанні.[60] У той час як Украіна мае падставы асцерагацца адкрыцця паўночнага фронту, яна павінна прызнаць, што большасць беларусаў не падтрымлівае расейскую агрэсію супраць Украіны.[61]

### 4. Высновы і рэкамендацыі

112. Беларусы, якія пакінулі сваю краіну пасля сфальсіфікаваных прэзідэнцкіх выбараў у жніўні 2020 года, былі вымушаныя зрабіць гэта з-за ціску ад рэжыму Лукашэнкі. У выніку гэтага прымусовага выгнання яны сталі ахвярамі парушэння правоў чалавека ў тых краінах, дзе яны знайшлі прытулак, што часам з’яўляецца ненаўмысным наступствам санкцый, накладзеных на рэжым Лукашэнкі.

113. Нягледзячы на тое, што іх галоўнае жаданне – вярнуцца ў дэмакратычную Беларусь, чым больш сыходзіць часу, тым больш аддаленай падаецца гэтая перспектыва. Ліквідацыя юрыдычных, адміністрацыйных і практычных перашкод, з якімі яны сутыкаюцца, і аказанне падтрымкі беларусам у выгнанні павінна стаць прыярытэтам для дзяржаў-удзельніц Рады Еўропы, таму што дэмакратычная і бяспечная Беларусь з'яўляецца часткай вырашэння праблемы бяспекі ў Еўропе.

114. Нельга ігнараваць той факт, што дэмакратычныя сілы імкнуцца стварыць «новую Беларусь» у выгнанні. Неабходна падтрымліваць іх намаганні аблегчыць праблемы, з якімі сутыкаюцца суайчыннікі. У той жа час, для таго, каб пазбегнуць гетаізацыі і псіхалагічнага адчужэння, беларусам у выгнанні неабходна інтэгравацца ў грамадства тых краін, дзе яны знаходзяцца.

---

[59] Інтэрвію з Free Belarus Center.
[60] HELP REFUGEES! (byhub.org), Free Belarus Center.
[61] Пераасэнсаваць палітыку Захаду ў дачыненні да Беларусі | Chatham House – International Affairs Think Tank.

115. Гэты даклад дае прагматычныя і практычныя прапановы дзяржавам-удзельніцам Рады Еўропы, у якіх знайшлі прытулак беларусы, якія ратуюцца ад рэжыму Лукашэнкі. Гэтыя прапановы маюць на мэце забяспечыць, каб беларусы ў выгнанні маглі жыць як мага больш нармальным жыццём, і, прынамсі, не мелі перашкод для ажыццяўлення сваіх асноўных правоў. Гэты даклад трэба разглядаць як аснову для нацыянальных парламентаў зацікаўленых дзяржаў і кампетэнтных органаў, каб усе 46 дзяржаў-удзельніц Рады Еўропы маглі забяспечыць калі не скаардынаваны, дык хаця б эквівалентны ўзровень абароны беларусаў у выгнанні, дазваляючы ім інтэгравацца і пры гэтым захоўваць і ўмацоўваць сваю нацыянальную ідэнтычнасць.